Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 39 (2889) Год LVI | Беласток, 25 верасня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Развітанне з Цэнтрам

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Гэта тут праводзіліся вернісажы мастакоў і прамоцыі творчасці іншых творцаў з Беларусі. Гэта гэтая ўстанова культуры па сваіх магчымасцях падтрымлівала творчасць беларусаў пражываючых на Падляшшы і была ў культурным сэнсе сувязным паміж Беларуссю і Беласточчынай, у якой пражываюць карэнныя беларусы. Тут таксама сустракаўся з беларусамі Беласточчыны, напрыклад, міністр культуры Рэспублікі Беларусь, а раней пасол гэтай краіны ў Польшчы Павел Латушка. Усё паказвае на тое, што Культурны цэнтр Беларусі (КЦБ) пасля ледзь трох гадоў дзейнасці з канцом верасня перастае існаваць у Беластоку. Кажуць, патрабуе гэтага польскае Міністэрства замежных спраў.

На апошняй выставе ў КЦБ у Беластоку, Аляксандр Карачун (справа)

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Аляксандр Карачун, дырэктар КЦБ у размове з „Нівай" не скрываў:

— З першага дня ад заснавання Цэнтра не адабрала нас у Беластоку польскае МЗС. Не змагу сказаць, чаму. Са мною ніхто не кансультаваў рашэння аб перанясенні.

Генеральны консул РБ у Беластоку Аляксандр Берабеня прызнаўся:

— Дзейнасць Культурнага цэнтра Беларусі не ўваходзіла ў мае кампетэнцыі. Непасрэдна падлягала нашаму пасольству. Аднак, для мяне перанос Цэнтра ў Варшаву не быў нечаканым рашэннем. Наколькі ведаю, такая польская палітыка наконт такіх устаноў — падобная як і ў адносінах да іншых дзяржаў.

Прэс-сакратар МЗС у Мінску Андрэй Савіных у размове з „Нівай" сказаў:

— Рашэнне аб пераносе КЦБ з Беластока ў Варшаву было падыктавана нам польскім бокам. Паколькі польскі бок стаіць на тым, каб Культурны цэнтр Беларусі быў у Варшаве, значыць, мы прымушаны прыняць гэтае патрабаванне як патрабаванне гэтай краіны, у якой прабываем. Хачу, аднак, адзначыць, што беларускі бок зробіць усё што ад нас залежыць, каб захаваць высокі ўзровень нашага культурнага супрацоўніцтва ў беластоцкім рэгіёне і з папярэдняй інтэнсіўнасцю.

Рафал Собчак з прэсавага бюро МЗС у Варшаве ў сваю чаргу гарантаваў нам:

— Няма гаворкі ані пра перанясенне КЦБ у Варшаву, ані пра яго ліквідацыю. МЗС РБ і РП вядуць негацыяцыі аб пакліканні ў Варшаве ўстановы па ўзору Польскага інстытута ў Мінску. Адпаведнае пагадненне не выключае функцыянавання падобных па характары ўстаноў у іншых гарадах краіны, між іншым у Беластоку. Што больш — пагадненне юрыдычна рэгулюе магчымасць функцыянавання такога цэнтра ў Беластоку.

Андрэй Савіных, каментуючы гарантыі Рафала Собчака, заявіў:

— Не ведаю, што яны маюць на думцы. У цяперашні час адназначным з'яўляецца патрабаванне польскага боку аб перанясенні КЦБ у Варшаву. Ведаю, што ў гэтай справе вяліся з намі кансультацыі. Не ведаю, у якой форме, ці ў пісьмовай. Напэўна польскае стаўленне да гэтай тэмы дайшло да нас у адназначны спосаб. Фактычна, рыхтуецца пагадненне на тэму паклікання ў Варшаве беларускай установы па ўзору Польскага інстытута ў Мінску і будзе яно рэгуляваць дзейнасць такіх устаноў на тэрыторыі абедзвюх краін. Аднак, яно не рэгулюе існавання падобных устаноў у іншых гарадах. Гэта такое рамачнае пагадненне. Там не рэгулюецца напрыклад таго, што ў Беластоку будзе такі цэнтр культуры.

Мы хацелі даведацца прозвішча асобы ў польскім МЗС, якая — магчыма — патрабавала перанясення КЦБ у Варшаву. Андрэй Савіных:

— Я не ў змозе сказаць прозвішча канкрэтнай асобы. Вядома, любыя інфармацыі ў гэтай справе пераходзілі праз нашае пасольства ў Варшаве. Прапаную вам спрабаваць даведацца і пра гэтую, калі яны не будуць хацець з-за нейкіх прычын яе прамаўчаць. Адно магу ўпэўнена сказаць: гэта цвёрдае патрабаванне польскага МЗС. Хто канкрэтна за ім стаіць, з пункту гледжання нашага МЗС не такое вельмі важнае. Можаце спытацца яшчэ ў полькага МЗС, яно не павінна хаваць такой інфармацыі ад уласных грамадзян.

Прэс-сакратар пасольства РБ у Варшаве Аляксей Зелянко тлумачыў нам досыць загадкава:

— Удакладненні на гэтую тэму вяліся паміж МЗС у Мінску і ў Варшаве. Былі націскі на такое рашэнне польскага МЗС. Ніхто з боку нашага пасольства такіх размоў не праводзіў. Цяжка мне знайсці віноўніка гэтай сітуацыі.

Рафал Собчак:

— Размовы да гэтага часу вяліся на ўзроўні экспертаў.

Тым часам каля трыццаці подпісаў прадстаўнікоў гмін і паветаў Падляшскага ваяводства, у якіх пражываюць беларусы, галоўным чынам самаўрадаўцаў, апынулася пад лістом Аляксандру Лукашэнку за захаванне ў Беластоку Культурнага цэнтра Беларусі. Ян Сычэўскі, лідар Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы сказаў Радыё Рацыя:

— КЦБ спрыяў развіццю беларускай культуры, утрыманні яе на годным узроўні, пачуцця нашай тоеснасці, падтрымліваў беларускія мерапрыемствы. Гэта быў важны стымулятар развіцця і ўтрымання нашай нацыянальнай, беларускай культуры сярод беларусаў Беласточчыны. Вядома, калі адлегласць паміж намі будзе большая ў тэрытарыяльным сэнсе, будзе яна таксама большай у арганізацыйным і духоўным сэнсе.

Калі мы папрасілі яго сказаць пра дэталі наконт гэтага ліста, між іншым пра тое, хто быў ініцыятарам яго напісання, сказаў: „Нічога больш не магу сказаць".

У нашай размове з Андрэем Савіных аказалася, што прэзідэнт Лукашэнка ўжо даў адказ у справе КЦБ. Ліст прэзідэнта быў накіраваны на рукі Гражыны Валкавыцкай, шэфа Таварыства беларускай культуры:

— Не магу прывесці даслоўна гэтага пісьма, бо я не ягоны адрасат, ды спадар прэзідэнт выказаў шкадаванне па прычыне пераносу Цэнтра і звярнуў увагу на тое, што беларускі бок не можа тут умешвацца ў рашэнні польскай дзяржавы. Прытым разлічвае на яшчэ лепшае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з беларусам ў Польшчы.

Гражына Валкавыцкая была для нас няўлоўная.

Бульбяная валюта

У верасні ў беларускім грамадстве ў цэнтры ўвагі апынуліся дзве праблемы — бульба і валюта. Ну, збіранне караняплодаў на пачатку восені — гэта штогадовая рытуальная бітва за ураджай. А вось змаганне за валюту адбываецца не так часта, пэўны перыяд з доларамі і еўрамі ўвогуле не было ніякіх асаблівых праблемаў. У адных таму, што, як казаў пра грошы казачны кінагерой, „дробных няма, а буйных ніколі і не было", а ў іншых таму, што здаць ці купіць валюту яны маглі ў шматлікіх абменных пунктах. Бягучы год, аднак, прынёс значную дэвальвацыю нацыянальных грошай. Насоўвалася яна на Беларусь няўхільна, пакуль не дасягнула моцы ўрагану „Катрына" — нягледзячы на запэўніванні першых асобаў дзяржавы пра стабілізацыю, беларускі рубель абясцэніўся больш чым у два разы. Зноў узнік „чорны", але рэальны курс еўра і даляру, а абменныя пункты пачалі зачыняцца, паколькі ніхто валюту туды не нёс. Роздум дзяржаўных чыноўнікаў на класічную тэму „Што рабіць?" доўжыўся месяцы два. І вось нешта прыдумалі. На пачатку па тэлеканалах пракруцілі дакументальную стужку, прысвечаную тэме хуткага і непазбежнага абвалу курсу долара. Фільм не прымітыўны, як бывае найчасцей у нашых рэаліях, а дастаткова хітры, з рознымі каментарамі міжнародных экспертаў, графікамі і нібыта лагічнымі меркаваннямі. Падліла смалы ў агонь і галоўная банкірка краіны Надзея Ермакова, якая ў эфіры аднаго з каналаў паведаміла, што ўжо ў бліжэйшы тыдзень курс долара ў дачыненні да беларускага рубля можа рэзка панізіцца. У беларусаў у хаце зазвычай дзве асноўныя іконы — тэлевізар і радыё. А хіба ж могуць „па цілівізары" ды „па радзіве" гаварыць няпраўду!? А тут яшчэ заваблліваюць пакласці беларускія грошы ў банкі пад вялікія працэнты. Багатая наша краіна на аптымістаў, асабліва, што датычыць людзей старэйшага пакалення. Ужо колькі разоў яшчэ з савецкіх часоў падманвалі насельніцтва рознымі дэнамінацыямі і дэвальвацыямі, аднак, не перавяліся яшчэ тыя, хто можа паверыць у „дзеравяны", як яго называюць у народзе, рубель. Хоць ніякі не драўляны ён, бо дрэва яшчэ досыць цвёрдае, а бульбяны ўжо.

Курс долара ў бліжэйшы час можа сапраўды знізіцца. Гэта звязана найперш з тым, што прадпрыемствы мусяць выплаціць падаткі ў беларускіх рублях. Па-другое, людзі сапраўды пачалі здаваць амерыканскія банкноты ў афіцыйных абменніках. Па-трэцяе, эканоміку на пэўны час ўдасца крыху стабілізаваць за кошт кітайскага крэдыту. Роднасны „азіяцкі брат" з берагоў Хуанхэ і Янцзы прыйшоў на выручку ўраду сінявокай Беларусі. Падкінуў нафтадаляраў з берагоў Каспію і аліеўскі рэжым. Чакаюцца „шчадроты" і ад іншых дабрадзеяў. Нічога, што знешні доўг на кожнага жыхара Беларусі вырас ужо да 4 тысяч долараў — амерыканскі ж „зялёны" ўсё роўна абваліцца, вось і аддаваць нічога не давядзецца. Ды і пасля нас не будзе нас!

Што датычыць бульбы, то і тут сезон выдаўся таксама надзвычай складаным. Летась у Беларусі былі адзначаны рэкордныя кошты на бульбу. Вясковае насельніцтва ўпершыню за апошнія гады добра зарабіла на продажы „другога хлеба". Многім падалося, што вырошчванне бульбы можа стаць нават прыбытковым. Але сёлета склалася зусім іншая карціна. Цэны засталіся ранейшымі, а то і меншымі (а значыць, што з улікам дэвальвацыі беларускага рубля знізіліся ў некалькі раз). Прапалі і залётныя і шматлікія расійскія пакупнікі, у гэтым годзе усходнія суседзі ні то самі вырасцілі ўраджай, ні то сталі купляць бульбу ў іншых краінах. Так што беларускім сялянам з улікам імкліваго росту коштаў на іншыя прадукты харчавання і кепскага збыту бульбы зноў давядзецца засыпаць „картоплю" ў засекі і капцы і гадаваць свіней. Наш адвечны кругаварот натуральнай сельскай гаспадаркі. Давялося зусім нядаўна праехацца ажно па некалькіх раёнах Заходняй Беларусі. Вачам абапал дарог і ў вёсках паўставала карціна цяжкой знясільваючай працы — фігуры ў баразне, мяхі з бульбай на вазах, „усюды панурыя людзі" — як сто і дзвесце гадоў таму.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нясвінні

Як жа цяжка ў рэальнасці складзенай з нюансаў і семантычных паўтонаў выканаць евангельскі запавет, каб „так-так" значыла так, а „не-не" значыла не — тым больш, што супольнай рысай усіх людзей з'яўляецца схільнасць да рэлятывізавання! Пацвярджэннем вышэйсказанага тэзіса хай паслужыць аповед, якога я быў адным з герояў. Вось у час падрыхтовак да міжнароднага культурнага форуму, які меў адбыцца ў Беластоку, я сустрэўся з афіцыйнай дэлегацыяй Украіны, тады яшчэ савецкай. Госці вельмі націскалі, каб на літаратурны сімпозіум запрасіць адну паэтку, неабавязкова апазіцыянерку, але таксама і неабавязкова спрыяючую савецкай уладзе. Але, каб яе асобе дадаць значэння найвышэйшага рангу, называлі яе з французскага, ды згодна з рускамоўнай традыцыяй — паэтэсай, што ў маім вуху гучала надта пампезна. А перш за ўсё папахвала прапагандысцкім круцельствам. Таму я запёрся і тае дамы не запрасіў. Пасля зразумеў, што нават для гэтых афіцыёзаў прадстаўляючых савецкую ўладу асоба, якая супраць эгаістычных рацый выказваецца ў паэтычнай фразе ў русіфікаванай, значыць, мардаванай на ўсе спосабы ўкраінскай мове, звычайнай паэткай быць не можа. Для іх яна была паэтэсай — кімсьці выключным, што адзначалі са шчырым захапленнем — і ўсё тут! Ды што цікавае, калі я дэкаду пазней сустрэў яе выпадкова і расказаў пра прычыны, з-за якіх не была яна запрошана, паэтка зрэагавала ў спосаб які мяне ашарашыў: — Ну дык халуі! — буркнула; або надалей памятала вымушаныя на ёй уступкі і з-за гэтага паэтычныя змоўчванні, або збянтэжаная колішняй падтрымкай гэтых афіцыёзаў, якая паставіла пад знакам пытання паказваную ёю быццам бы нязломную апазіцыйнасць. Як відаць, неадназначных нюансаў у вышэйпрыведзенай гісторыі ёсць шмат і не так лёгка прыкласці да яе евангельскую мерку. Можа таму, што ўсё, што вяжацца з чалавечай кандыцыяй, здаецца быць расплыўным, паколькі факты, на якіх хочам апіраць праўду, ёсць імі настолькі, наколькі не абмінаецца іх кантэкстаў. А тыя ж, з-за рухомасці інтэрпрэтацыйнай оптыкі, лёгка паддаюцца ядам рэлятывізму.

Ёсць, аднак, такая сфера, у якую ўзіраючы, можна заняць толькі адну з дзвюх пазіцый — так або не. Інакш немагчыма. Гэта сфера нацыянальных пачуццяў. Спасылаюся тут на апошнія выбрыкі трагладзітаў, якія развальваючы будаваны з такім трудом кансенсус суіснавання нацыянальных меншасцей і польскай большасці, з асаблівай заўзятасцю зневажаюць сімвалы тоеснасці яўрэйскай, літоўскай ці беларускай меншасцей. Я б хацеў такія паводзіны назваць халуйствам. На жаль, у гэтым відным паняцці ёсць нейкая нятрапнасць. „Халуй" значыць хам, і то ў найбольшым насычэнні пагарды адчуваючага яго хамства нябогі. Так вось дасведчанне чыйгосьці халуйства вяжацца з асабістым пачуццём пякучай пагарды, што дае ў выніку балючую траўму. І аналагічна, называючы кагосьці халуём, узяў бы я на сябе ўсе звязаныя з гэтым адыёзнасці, а да гэтага я ў ніякім выпадку не хацеў бы дапусціць. Бо дзеля чаго меў бы я пакутаваць за ідыётаў? Хопіць ужо, што пакутую **з-за** іхніх паводзін нягодных нават свінні. Няхай таму будзе, што гэта „нясвінні"!

Нясвінні заўсёды паслугоўваюцца якойсьці ідэалогіяй і нават неяк яе абгрунтоўваюць. Трэба, аднак, памятаць, што гэта ёсць ідэалогія, якая — на падабенства кукурузы якой прышчапілі ген пацука — кіруецца трансгенічнай логікай, якая з'яўляецца надта плённым відам дурноты ўстойлівай ад талковай аргументацыі так з пазіцыі чалавечага інтэлекту, як і свінскай уражлівасці. Нясвіння, затым, не думае мозгам, толькі атручанымі рацыямі атупелага статку. Нясвіння, наканец, не мае ўласнай думкі, калі штонебудзь выказвае, дык артыкулюе гэта абягаючай статак мовай банальнасцей, дэмагагічных лозунгаў і нецэнзурных правакацый. І гэта было б, здаецца, усё, што я хацеў бы сказаць на гэтую тэму. Бо што ж можна сказаць больш? Хіба толькі тое, што і халуі, і нясвінні гэта частка кожнага грамадства. Толькі ці мусяць быць яны яго часткай?! Ну, „так-так", ці „не-не"?

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Расізм на стадыёнах

Пад маім акном ад гадоў расце вялікае дрэва. Апошнім часам сталі пад ім збірацца пасёлкавыя крыклівыя п'янчужкі. Сустрэў я суседку, дзеячку пасёлкавай рады, якая аднойчы мне кінула: „Штосьці ўрэшце трэба з гэтым зрабіць!", а праз хвіліну одуму дадала адкрыўча: „Прыйдзецца высекчы гэтае дрэва!"

Гэтая размова збеглася з расісцкімі і ксенафобнымі здарэннямі, якія мелі месца на Падляшшы ды ранейшым, адным з апошніх у гэтым тэрміне, паседжаннем сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей. Дэпутаты разам з чыноўнікамі м.інш. міністэрстваў спорту і ўнутраных спраў ды прадстаўнікамі паліцыі і згуртавання „Nigdy Więcej" абмяркоўвалі тое, як супрацьдзейнічаць расізму на польскіх стадыёнах. Была гаворка таксама пра сітуацыю на ўкраінскіх стадыёнах, на якіх праз год таксама будуць разыграны матчы ў рамках чэмпіянату Еўропы па футболе. Як сказала генеральны саветнік у міністэрстве спорту Уршуля Янкоўская, на працягу апошніх васемнаццаці месяцаў на стадыёнах у Польшчы і Украіне зафіксавана каля двухсот інцыдэнтаў расісцкага характару. Так прынамсі вынікае з рапарту, які ўзнік дзякуючы Цэнтру маніторынгу расізму ва Усходняй Еўропе, пакліканаму перш за ўсё дзякуючы згуртаванню „Nigdy Więcej".

— Адной з большых падзей была канферэнцыя „Не — расізму ў спорце", дзе была падпісана дэкларацыя ўсімі спартыўнымі саюзамі і вялікімі няўрадавымі арганізацыямі, якая абавязвае гэтыя арганізацыі да прэвенцыйных і адукацыйных дзеянняў.

Спаслалася прытым на адзін з навейшых дакументаў Еўрасаюза, дзе напісана: „Насілле і парушэнні публічнага парадку, выкліканыя заўзятарамі — з'ява выступаючая ва ўсёй Еўропе і неабходным з'яўляецца еўрапейскі падыход, ахопліваючы сродкі апрацаваныя з мэтай змяншэння звязаных з імі пагроз [...]. Больш шырокі падыход, ахопліваючы таксама іншыя дысцыпліны спорту і засяроджаны на папярэджанні насілля і правапрымяненні будзе патрабаваць больш цеснага супрацоўніцтва зацікаўленых бакоў такіх як службы паліцыі, судовыя ўлады, спартыўныя арганізацыі, арганізацыі заўзятараў і публічныя ўлады. Як паказала нядаўнае даследаванне Агенцтва па асноўных правах ЕС, расізм і іншыя формы неталерантнасці надалей ствараюць праблемы ў еўрапейскім спорце, у тым ліку і на аматарскім узроўні".

У час самога паседжання сеймавай камісіі, сакратар Згуртавання „Nigdy Więcej" Рафал Панкоўскі сказаў:

— Я хацеў бы адзначыць, што за апошнія два гады меў месца вельмі важны працэс кранаючы польскі футбол, які выклікаў тое, што польскі футбол, таксама на клубным узроўні, з'яўляецца шматкультурным спортам. Гэта можа быць сімвалам шырэйшых змен, якія адбываюцца ў нашым грамадстве ці генеральна ў еўрапейскіх грамадствах. Змяняецца ўспрыманне групавай тоеснасці, выказанай спартыўнымі эмоцыямі, ды незалежна ад таго праблема расізму і ксенафобіі на стадыёнах надалей з'яўляецца рэальнай праблемай. Вядома, расізм і ксенафобія не былі выдуманыя на стадыёнах, але так складваецца, што якраз на трыбунах, на спартыўных арэнах маем дачыненне з асабліва жорсткімі праявамі расізму і ксенафобіі.

Калі я аналізаваў „стадыённую" дэбату ў рамках паседжання сеймавай меншаснай камісіі, але і здарэнні да якіх дайшло ў Крынках, Орлі, Пунску, Ядвабным ці ў Беластоку, — не ведаю чаму мне на думку прыходзіў дыялог з суседкай аб дрэве пад маім акном.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Было ў Меляшках

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Паміж Гарадком і вёскай Меляшкі, што расклалася на старажытным грудзе, больш як паўстагоддзя таму была мокрая даліна, кажуць, можа і возера. За стадоламі гэтай доўгай вёскі высяцца два таямнічыя курганы, якія тут называюць „могілкамі". Тое возера ўявіць няцяжка — хопіць узабрацца на тыя „могілкі", і маем панараму як па люстры вады, — аж да ззяння гарадоцкай царквы. З крыніц ведаем, што ўся ваколіца мела дачыненне да старажытнага роду Хадкевічаў. Рыгор Хадкевіч за землі каля мястэчка Васількава, якія перадаў каралю, атрымаў ад Жыгімонта Аўгуста 22 сакавіка 1567 г. вёскі каля Гарадка — Белявічы, Супрасль Мсцібогаўскую (сёння Зарэчаны) і Меляшкі.

Меляшкі, першую вёску на Беласточчыне, дзе па абодвух баках вуліцы паклалі тратуары, калісь усе прыбіралі гуртом пад святы — царкоўныя і Першамаі. Замяталі дзеркачамі і брук, і тратуары. Цяпер зрэдчас каровы любяць прайсціся якраз не па бруку, а па ходніку. І не вельмі каму ёсць так салідна прыбраць сляды іхняй натуральнай дзейнасці. Ды пад Спленне ў Меляшках заўджы — баль! Пры славутых крыжах, што паставілі і размалявалі сябры „Зоркі", бацюшка служыць малебен. За ўсіх жывых меляшкоўцаў, якіх у апошні час перастала ўбываць. А гуляць яны і любілі, і любяць. Толькі чакаюць нагоды, нейкага свята, каб пачаставацца і пасмяяцца разам. Пасярод вёскі, пры краме — святліца. Тут сабрацца трэба ўсім, хоць Марта Герасімчук у першы момант кажа: „Не пайду я на герыятрыю!" Вядома, каго мае на думцы беластоцкая дзеўка, якая ўсё ж загляне пасля на новую імпрэзу.

Фірма „Яр-Дом" хваліцца на сваім сайце: у мясцовасці Меляшкі ў Гарадоцкай гміне выканалі яны рамонт святліцы, які палягаў на яе зносе, абмене старых канструкцыйных элементаў будынка, абмене крокваў, аконнай сталяркі, пакрыцця даху, выліцці паласы ўзмацняючай падмурак, мантажы шалёўкі і комплекснай апрацоўцы інтэр'еру. Новая святліца проста зіхаціць!

Пасвенцяць яе айцы Астапчук і Каханоўскі, разрэжуць стужку войт Кулеша, дырэктар Хмялеўскі і солтыска Назарка ды радная Врублеўская. Мірка Антановіч з Гарадка, з Кастэнчыкаў, падарыць гафтаваную крыжыкам ікону. Будуць прамовы, віншаванні і абяцанні. Пасля ўсе засядуць за сталы, зайграе капэла „Хутар". Будзе як калісь.

— Для вёскі добра зрабілі, святліца вырамантавана, маладзь ёсць, будзе каму гуляць. Ужо па нашым пакаленні будзе меў хто нас заступаць. Каб гэта ніц не згінула, — кажа Коля Кастэнчык. — Ведаеш, колькі меляшкоўцаў з альбома Паўліка Грэся няма ўжо ў жывых? Можа з дваццаць чалавек, можа больш. Фаня Барода першая памерла, яшчэ як ён альбом рабіў. Яшчэ на яе васьмідзесяцігоддзе крыху раней уся вёска гуляла ў старой святліцы. Чалавек не ёсць вечны. Тут у нас цётка што каля дуба жыла — да ста гадоў дацягнула, але ўжо ў Беластоку жыла. Во Верка Лявіцкая памерла сёлета ў 97 гадоў. З Кастэнчыкаў ужо я адзін застаўся,

— Ці ты спадзяваўся, што буде тут столькі дзяцей?

— Многія пакуплялі ў нас хаты. Ды яны ўсе — каталікі.

— У Меляшках заўсёды можна было гаварыць па-свойму. І малыя, і маладыя ведалі мову...

— Што па-нашаму мала тут гаворыцца? — Віктар Лотыш, стары солтыс упэўнены: — Гэта самі мы ў гэтым вінаваты. Бо паміж сабою гаворым па-свойму, а да дзяцей — па-польску. Не палагаецца нам, людзям, каторыя згэтуль...

— А ці мы так добра знаем гэты беларускі? Я вучылася ў пачатковай школе. — кажа спадарыня Вера Трахімчык. — Па-руску то лепш валодаю.

— Не, не. Мы ж маем наш свойскі, натуральны язык, — мяркуе дзядька Віктар.

— Паявілася з дзевятнаццаць новых радзін, што вы аб гэтым думаеце?

— Гэта ўсё каталікі. Чаго тут шукаюць? Шукаюць, дзе танней купіць.

— Калісьці у нас католік быў Бронак, Дамброўскі, Бронкава Ганна яшчэ жыве.

— Ёй хіба сто лет...

— Не, яна дваццаць першы рочнік, яна малодша ад нашай мацеры. Жыве ў Нінкі, у дачкі. Нашай маме ішоў 94 год, была пры памяці, можа каб таго разрушніка не ўставілі, то яшчэ жыла б... — мяркуе яго жонка Ліля.

— Па культуры трэба каб след застаўся, — кажа пані Вера. — У нас шмат здымкаў старых было, пытаюся ў мамы: хто на іх, а яна нікога ўжо не магла распазнаць. Старасць...

— Анэта, Дар'я і Эва, — прадстаўляюцца дзяўчаткі і Эва тлумачаць па-польску. — Мой тата механік, бацькі — Анна і Мар'ян Пухальскія. Я тут жыву ад нараджэння. Тата з Беластока, мама з Грыбоўшчыны. А Нюньчыны (Дарчыны) бацькі перасяліліся з Алецка. А Эўка — ад Анны і Мірка, Назаркавы. Вучымся ў Гарадку.

— Хто сказаў што маладых няма? — спытаўся дырэктар гарадоцкага Гміннага дома культуры Юрка Хмялеўскі, на выступленне Госі Пятэльскай на флейце. За Госяй на сцэну выскачыла Вікторыя... Браво! — запляскалі ў ладкі госці. А мы яшчэ раз ідзем па меляшкоўскім бруку.

— Гэту хату Васілёву — хата нумар 37 — купіў з Элка чалавек, за граніцаю робіць. Ужо 19 новых сем'яў пасялілася ў Меляшках, дзве толькі што, — кажа Сяргей Госцік. — Зусюль іх панаязджала. І не спадкаемцы, а проста пакуплялі. Маладых іх многа. І не так каб на лета, на дачы хаты куплялі, а проста жывуць. Адна дахтарыца, другі ў вайсковасці... Тут каля дуба — Марцінчык. Пастаянна жыве, мае двое дзяцей, самаходы прадае, купляе. Такое месца для жыцця знайшлі. Кажуць, спакойна ў нас. Хутчэй да Беластока даедзеш, як цераз Беласток праедзеш. Самаходам на працу едуць, або раніцай аўтобус едзе. А вярнуцца — то да Гарадка, або да Белявіч. Калісь пэкаэс даязджаў сюды папоўдні, ды знеслі яго. Але самаходам многія ездзяць, заўша хтось падвязе.

— А хто прыязджае да хаты бабы Тамашыхі — Любы Лавіцкай, сястры Янука Дарашкевіча?

— Унучак з дзецьмі, сын. Але толькі так прыязджаюць, на лета. А Юлька Дамань, цяпер Грыкава, дачка Веры Лявіцкай, што іграла ў Тамары Саланевіч у „Крэсавай баладзе", усё лета тут сядзіць. Унучкі і праўнучкі толькі калі на „Басовішча" прыязджалі, начавалі ў вялікай хаце.

— Я панасаджвала гародніны — і кабачкоў, і морквы... — кажа Юля Грыка, што ў Меляшках і паказвае сваю сціплую гаспадарку (дом апісаны на ўнукаў, жыве яна ў гаспадарчым, прыстасаваным будынку). — Але і не ўпільнавала — хтосьці мне амаль усю чорную парэчку павыбіраў, толькі кубачак сабе сабрала, — і ідзем з ёю да Пятэльскіх. — О, тут чужыя жывуць, — Юлька паказвае на надбудову над хатай, што свеціцца свежай драўнінай. — І ацяпленне даху зрабілі, а пабач як з таго боку хораша, і тэрасу зрабілі. Вокны ў даху. Жывуць дзяўчына з хлопцам, кажуць, што бацькі яшчэ за мяжою. Калісь тут жылі Васілёк Вейк з Нінкай, ужо нямаш іх, паўміралі. Застаўся Грышка з Іркай, і прадалі хату.

— То, Андруша, кажаш, што ўся вёска рабіла пры новай святліцы, — пытаюся ў Андрэя Пятэльскага.

— Гэта ўжо маладая экіпа цяпер! Новы солтыс — Аня Назарка. Баба-мужык, моцная: і на камбайне, і на маторы паедзе — на чым папала. Магла б, то і пэкаэсам ездзіла б!

— Уся вёска яе выбрала?

— Было трое кандыдатаў. Можа сказаць, што падапечныя яе выбралі, — смяецца Адрэй. — Трыма галасамі выйграла. Дзве гадзіны выбіралі. Стартавала яшчэ Лёнька Лавіцкая і Віця Лотыш, стары солтыс. Галасаваў перш за ўсё той канец вёскі. Пасля яшчэ месяц дыскутавалі. А цяпер столькі новых, і то цэлых сем'яў. Гарасімавы з Гарадка прыбылі, з Дзернякова прыбылі, з Беластока... З Італіі, машына мае яшчэ італьянскую рэгістрацыю! З-пад Сувалкаў. У Сонькі Крупіцкай новыя людзі жывуць. Сёлета зноў новыя сем'і ў нас аселі. У Барыса Карповіча — новая радзіна жыве. Барыс памёр (ён з 1926 года), жонка слабенькая. І старэйшыя людзі таксама купляюць, ужо пенсіянеры — спакою хочуць. У Барысовай хаце ўсё з сярэдзіны выкінулі, страху здзерлі, робяць нанава. Хатка маленькая, але ў гаражы салон робяць, і „горку". Пустыя хаты яшчэ ёсць. У суботу прадалі новую хату на канцы вёскі.

Малгося Пятэльская гуляе з коцікам, ныне пры гамонцы дарослых. Коцік чакаў яе вельмі з Беластока, увесь ранак мыўся...

— Ну, табе трэба кавалера знайсці ў Меляшках, у тваім узросце... — жартуе дзядзька Андрэй.

— Ну вэзьце! — злуецца малая.

— Быў адзін і той не прыехаў, што бегалі разам. Дастаў лапкаю-мухабойкаю! І мела рацыю! — жартуе з дзяўчынкі баба Юля. — Тлумачыўся пасля, што падмануў, быццам яе падглядаў! Адважная! — гэтая адважная другакласніца першая пойдзе на сцэну, каб паказаць свае музычныя ўмеласці!.

— Паявілася многа сем'яў з малымі дзецьмі. Ці будуць умець гаварыць пабеларуску? Ой, хіба не. Тут многа з Мазур прыехала, між іншым з Гіжыцка. Ёсць і з Торуні, — кажа Крыся Пятэльская. — Тут шмат людзей умірала, маючы сто гадоў. Ліда Госцік, баба Люба Лавіцкая, Вера Лявіцкая, баба Марыся... Добрае месца на жыццё. Дзе тут убачыш самаход — у канцы вёскі ўсюды лес, усюды свежае паветра. Няма якойсь фабрыкі. Брукаванка, як калісь, праз усе Меляшкі. Хацелі рабіць асфальт. Кажу: нашто той асфальт, каб смярдзела асфальтам? Брукаванка — хутка не папруць!

А што ў Марусі Савіцкай чуваць? Прыехала на адзін дзень на хату паглядзець. Жыве цяпер у Варшаве — муж дастаў туды камандзіроўку з працы, Маруся спакавалася і за мужыком паехала... Калі гаворым пра нашыя старажылкі, — каб дажыць да такіх гадоў, але ў здароўі, ходзячы ўміраць, — мяркуе пяцідзесяцігадовая Крыся. — А з майго рочніка, 1960, пару асоб вярнулася і гаспадараць — Галіна, Генік Лавіцкі...

— Ну, як гаспадарыцца, — кажа Галіна з Дарашкевічаў Лушчынская. — Я звольнілася з працы ў горадзе, 28 гадоў працавала ў Галоўным інспектараце кантролю якасці прадуктаў. І не наракаю. Мы з Міраславам не гонімся так як гэта рабілі раней, у горадзе, цяпер спакайней. Цяпер цалкам някепска, бо малако пайшло ў гару. Цяжкавата было, бо набралі мы крэдытаў. Муж тры гады раней пачаў тут працу. Маем 24 дойныя каровы. Не вельмі ўзбуйняем гаспадарку, хочам мець час і для сябе. Дзеці ў нас ужо дарослыя. Найгоршыя тут зімы, як засыпле!

— Дзякую, — кажа ў святліцы Янка Карповіч з „Хутара", родам з Меляшкоў, — перш за ўсё меляшкоўскім жанчынам, з гуртка вясковых гаспадынь, якія вялі тут паспяховую тэатральную дзейнасць, разварушвалі Меляшкі. Гэта дзякуючы ім развівалася культура ў Меляшках. І яна існуе.

— Ёсць культура, ёсць! — крычаць меляшкоўцы. І разам спяваюць „Многая лета", „Колькі ў небе зор"...

Шляхам гадоў

Вуліцу Сінюю ў Беластоку я наведаў пасля сарака гадоў. Столькі гадоў таму на кватэру ў доме № 6 прыняла мяне самотная бабуля. У гады вайны жылі ў яе на кватэры мае суседзі з Новага Ляўкова Лідзія і Васіль Грыгарукі. Яны далі мне пісьмо да жанчыны, якая жыла па вуліцы Сіняй, 6, і папрасілі прыняць мяне на кватэру. Я ў той час пачаў працаваць у Беластоку.

4 жніўня г.г. адправіўся я на вуліцу Сінюю. З вуліцы Агароднай павярнуў я на вуліцу Крашэўскага. Іду роўным, як верх стала, тратурарам. Іду і захапляюся. Паабапал вуліцы Крашэўскага новыя прыгожыя 2-, 3- і 4-павярховыя жылыя шматсямейныя дамы. А якая цікавая архітэктура! Вочы разбягаюцца. Усё новае і раней нябачанае. Вось дзе цікавыя архітэктурныя ўзоры будынкаў! Мне ў галаву прыйшла думка, што, мабыць, тут дамы для эліты, для выбраных — так усё адчаканена, дагледжана. Мінаю вуліцы, якія даходзяць або крыжуюцца з вуліцамі Крашэўскага, Старабаярскай, Арлінай, Парожняй і Каменнай. А вось і вуліца Сіняя. На ёй старыя-старыя тратуарныя пліты, а маставая — пясчаная. Гэтак было і раней. Тыя самыя старыя дамы. А вось там, дзе стаяў вялікі драўляны дом з нумарам 6 — пустая ўтравелая пляцоўка. Усё знеслі: дом і частакол і драўляныя шопкі. Знікла ўсё бясследна.

У агародчыку ля дома з нумарам 3А я ўгледзеў жанчыну і спытаўся яе, што сталася з домам № 6. Пачуў такі адказ: „Гаспадыня гэтага дома памерла дзесяць гадоў таму. Нехта падпаліў шопкі і быў пажар. Прэзідэнт горада загадаў разабраць дом. Не было наследнікаў". Спытаўся я пра свайго калегу Панасэвіча з дома № 5. Разам з ім мы закончылі Настаўніцкую студыю па вуліцы Міцкевіча, 1. Аказваецца, ён памёр. Вяртаўся я назад вуліцай Крашэўскага, залітай гарачым жнівеньскім сонцам (быў поўдзень). Іду і прыгадваю як тут было сорак гадоў таму. Стаялі невялікія шэрыя камяніцы, былі і драўляныя дамы. Тыя апошнія агароджаныя драўляным платамі. Каля іх раслі фруктовыя дрэвы. А тратуары былі ўхабістыя і не ўсюды там былі. Сярэдзіна вуліцы Крашэўскага — няроўны брук з палявога камення. Пасля дажджу на вуліцы стаялі лужы. Калі высыхалі, была гразь. Стаяў таксама невялікі касцёл. А зараз тут новенькі касцёл, мураваны, з дзвюма вежамі.

Па вуліцы Крашэўскага была рэдкая забудова. Жыллёвыя блокі стаялі воддаль. Было шмат вольнай прасторы. Тут была ўсяго адна невялікая прадкутовая крама. Хто тады думаў, каб адкрыць — напрыклад — прыватную галерэю мастацтва! А зараз працуе галерэя „Ярома" (вул. Крашэўскага, 21).

Аднавілі „Выгоду"

23 жніўня г.г. адкрылі — пасля грунтоўнага рамонту — краму „Выгода" ПСС „Сполэм" у Беластоку па вуліцы Траўгута. Аднавілі сцены звонку і ўсярэдзіне, пабудавалі новы дах. Зараз на ўдвая большай плошчы будуць прадаваць вяндліны і мяса, рыбу, хлебабулачныя вырабы, агародніну і садавіну. Мадэрнізавалі склад харчовых прадуктаў і сацыяльныя памяшканні. У супермаркеце замянілі новымі перш за ўсё вокны і дзверы, а таксама ўсё абсталяванне крамы.

Варта дадаць, што прад супермаркетам знаходзіцца бясплатная стаянка для аўтамабіляў пакупнікоў. **(яц)**

Ілона КАРПЮК

Радасць без абмежаванняў

У кантэксце парламенцкіх выбараў вельмі актуальнай тэмай сталіся асобы абмежаваныя, у асноўным фізічна, ды іх доступ да ўдзелу ў выбарах. Грамадства аднак адмяжоўвае іх не толькі ў гэтым кантэксце, але і ў іншых, шматлікіх сферах. Асабліва датычыць гэта абмежаваных інтэлектуальна, якіх найчасцей увогуле не заўважаем. Група такіх людзей, якая сустракаецца ў інтэграцыйнай святліцы ў Беластоку, за апошняе паўгода падрыхтавала фільм, які на 8. Еўрапейскім фільмавым фестывалі „Інтэграцыя ты і я" ўзяў першую ўзнагароду у катэгорыі аматарскіх фільмаў.

Падумайце момант, дзе і калі бачылі інваліда ці асобу абмежаваную інтэлектуальна. Калі не жывеце пад адным дахам з такой асобай, я амаль упэўненая, што большасці складана будзе такую сітуацыю прыгадаць. Абмежаваныя фізічна надалей адчуваюць архітэктурныя складанасці і ў горад зачаста не запускаюцца. Інтэлектуальна абмежаваныя прыхаваныя ў дамах. Іх сем'і вельмі часта саромяцца. Намнога лягчэй завесці іх у нейкую святліцу, дзе будуць глядзець фільмы, маляваць, займацца рукадзеллем — у сваім крузе.

— Вельмі часта бывае так, што яны ўдзельнічаюць у святліцах, у якіх гадамі займаюцца ў майстэрнях нейкімі рэчамі і сустракаюцца на сваіх фэстах, але такім чынам свет пра іх не даведаецца, — кажа Аліна Бэндзюк з Таварыства падтрымлівання грамадскіх ініцыятыў „ALPI", якое вядзе Інтэграцыйную святліцу ў рамках праекту „Тоеснасць горада — без выключэння". — Мы не хочам працаваць гэтым ходам. Мы падыходзім да іх як да людзей не абмежаваных, а людзей з канкрэтнымі магчымасцямі, якімі трэба скарыстацца, трэба паказаць.

Ужо самая сістэма працы гэтай святліцы паказвае на іншы падыход. Ёсць там трэнеры хатніх працаў, якія вучаць, напрыклад, як зрабіць сабе бутэрброд, бо бывае, што дарослыя людзі не ўмеюць нават гэтага. У хаце бацькі не дапускаюць іх да звычайных, штодзённых дзеянняў якраз з увагі на абмежаванасць. Хочацца верыць, што гэта вынік неабмежаванага бацькоўскага кахання.

Тут яны вучацца нават як прыдбаць хату ці падрыхтаваць вялікі абед.

— Можа ў вас свабоднае пасляпоўдне? — пытаецца адна з апякунак. — Сёння ладзім прошаны абед.

— На абеды запрашаем знаёмых і не толькі, але людзей спраўных і здаровых. Увесь час стараемся, каб нашыя ўдзельнікі сустракаліся ў штодзённых сітуацыях са здаровымі людзьмі, — дадае спадарыня Аліна ды працягвае: — Наша ідэя: заангажаваць у працу з гэтымі людзьмі асобы, якія займаюцца канкрэтнымі рэчамі ў сваім асяроддзі, маюць нейкую прафесію і ахвотна сваё захапленне перададуць нашым падапечным. Ужо пару месяцаў нашыя падапечныя ставяць спектакль „Станцыя", які сваю прэм'еру меў у час Дзён сучаснага мастацтва ў Беластоку. А гэты фільм — поўны радасці, бо аказваецца, што абмежаваныя — вясёлыя і ўмеюць фантастычна гуляць.

Фільм „Мара пра Дзікі захад" меў сваю прэм'еру 8 верасня, а два дні пазней аказалася, што стаў пераможцам еўрапейскага фестывалю „Інтэграцыя ты і я" ў Кашаліне. У ім бачым, як удзельнікі святліцы працуюць над стварэннем вестэрна, інспіраванага класікай жанру „Аднойчы на Дзікім захадзе" Сержа Леонэ.

— Я займаўся візуальным бокам, глядзеў як цікава паказаць гэтыя спробы, а Радэк (Дамброўскі — рэд.) прыдумаў цэласць і быў такім дырыжорам, — расказвае Марэк Уладзіміраў.

Абодва фільмоўцы працуюць незалежна, але згуртаваныя таксама ў падляшскіх нефармальных групах „Фільмавае Падляшша ў атацы" ды „Podlasie makes me happy", якія распавядаюць у сваіх карцінах пра Падляшша.

— Напэўна гэта самы складаны праект, з якім працуем. Калі гуляеш у быццё фільмоўцам, пачынаеш з навукі працы з камерай, мантажу і гэтак далей, а тут паўгода пазнавалі гэтых людзей і вучыліся як з імі працаваць і што можам з імі зрабіць. Сёння напэўна ведаем як гэта рабіць, — прызнаюцца інструктары фільму.

— Ідэя была такая, каб вельмі блізка, на экране, звычайны глядач пабачыў людзей, якіх штодзень не бачыць. Няхай глядзіць, спакойна, без стрэсу, няхай з імі пазнаёміцца.

— Клопатам з'яўляецца абмежаваны, які паяўляецца ў дзеяннях накіраваных для спраўнай, „нармальнай" часткі грамадства, — дадае Аліна Бэндзюк. — Выклікае страх і адмежаванне. Абмежаванасць ёсць надалей ізаляваная, большасць мерапрыемстваў накіраваных да такіх асоб адначасна ізалююць іх з грамадства, бо маем святкаванні, фестывалі, вечарыны, сустрэчы ДЛЯ АБМЕЖАВАНЫХ, для інвалідаў. Няма найчасцей элементу інтэграцыі з людзьмі спраўнымі. Па шчырасці, праблема не ў абмежаванасці, а ў тым, што спраўныя людзі не ведаюць як сябе паводзіць пры інвалідах.

— Гэта нармальныя людзі, — перабівае Марэк. — З пачуццём гумару, толькі крыху па-іншаму камунікуюцца з грамадствам, з увагі на сваю абмежаванасць маюць наогул ніжэйшы інтэлектуальны ўзровень, таму камунікацыя з імі ёсць часта ўмоўная.

Як падкрэсліваюць фільмоўцы, праца ў такой групе гэта вялікі выклік, самы складаны фільмавы праект для іх, але важны.

— У святліцу прыходзяць розныя людзі, паколькі на Падляшшы сужыве шмат рэлігіяў, веравызнанняў, нацыянальнасцей. Людзі гавораць рознымі мовамі, але тут самае важнае, каб злавіць спецыфічную мову гэтых людзей. Тут культурныя адрозненні перастаюць мець значэнне, бо важнейшай ёсць іншая, універсальная мова гэтай часткі грамадства, на якой загаварыць не хочуць здаровыя, — кажа Марэк. — Тое што робім можа не мастацтва, можа лепш сказаць — такі фокус! Бо мы папраўдзе зрабілі штучку, скралі выяву гэтых людзей, але ў выглядзе натуральнага, паўсядзённага партрэту ды паказалі гледачу. Гэта хутчэй дакументальнае кіно.

На экране відаць незвычайную ўражлівасць герояў як адну з асноўных рысаў гэтых людзей.

— Люблю граць у фільме і хацеў бы зайграць яшчэ, — кажа Марцін.

Не толькі ён. Наступных праектаў і сцэнарыяў чакаюць усе ўдзельнікі фільмавых заняткаў.

— Варта чакаць і працаваць дзеля моманту, калі нас віншуюць і чуем апладысменты, — дадавалі дзяўчаты.

— Калі яны даведаліся пра ўзнагароду, былі сапраўды шчаслівыя, рэагуюць імгненна на такія сігналы, адчуваюць сябе тады цэненымі, больш вартаснымі, адкрытымі. Разумеюць, што вакол іх адбываецца, гэта не малыя дзеці, — каментуе Аліна.

— Не забывайма, што мы працуем з дарослымі людзьмі: адным 25 гадоў, іншым пад 60, у вялікай ступені яны рашаюць самі пра сябе. Яны для нас найважнейшыя і засяроджваемся на іх рэакцыях на нашыя прапановы, — гаворыць Радэк Дамброўскі.

Таварыства падтрымлівання грамадскіх ініцыятыў „ALPI" сваіх дзеянняў не накіроўвае ў бок узнагародаў.

— Калі яны ёсць, напэўна працуюць як допінг, не толькі для нас, але і для іншых арганізацый, — кажуць аўтары праекта.

Інтэграцыйную святліцу ў рамках праекта „Тоеснасць горада — без выключэння" Таварыства „ALPI" вядзе дзякуючы фінансаванню са сродкаў Эўрасаюза.

— Не ведаю, як дакладна выглядае сітуацыя абмежаваных у Еўрасаюзе, але ў нас бачым шмат праблем. Як грамадства надалей не разумеем, што гэта свет павінен вучыцца абмежаванасці, а не наадварот! — падводзіць Аліна Бэндзюк.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Няма такога другога паэта ў Беларусі!

У лясны хутар «Полымя» што непадалёк Семяноўкі, мы прыехалі ў вясёлай жаночай кампаніі, раней крышку паблудзіўшы па лясных дарогах. Да Уладзіміра Гайдука: 7 верасня паэт сустракаў свой круглы юбілей — 70 год!

Мы былі прыемна ўзрушаны, калі на месцы пабачылі яшчэ спадарства Галіну Тварановіч і Яна Чыквіна, якія памяталі пра свята. Валодзю павіншавалі мы ля яго белай хаты, сярод квітнеючых «чабуткоў» і хмары пчол, якія кружылі ў агародчыку. Нас адразу запрасілі сесці за святочны стол, падрыхтаваны дбайнай рукой спадарыні прафесар. За чаркай віна мы ўспаміналі мінулае, добрых людзей. Са свежых адмаляваных сцен спазіралі на нас багародзічныя іконы і беларускі каляндар „Нівы". Час ад часу Міра Лукша брала ў рукі „Полымя роднае" і чытала ўголас, пад воплескі кампаніі, вершы юбіляра.

Да сказанага хацелася б нам далучыць інтэрв'ю з прафесар Галінай Тварановіч, якая ў Полымі бывае з 1997 года, прынамсі два разы ў год, і як сама адзначае: абавязкова ў дзень нараджэння Уладзіміра Гайдука.

Ганна Кандрацюк: ***— Памятаеце момант, калі першы раз Вы завіталі на хутар Полымя і пабачылі Валодзю Гайдука?***

Галіна Тварановіч: — У Полымя я трапіла пад аўрай паэзіі Уладзіміра Гайдука. Ян Чыквін якраз рыхтаваў яго зборнік „Пах аернага хлеба". Першае ўражанне ад сутыкнення з гняздом паэта было такое: я ў Беларусі. І гэтая мова — амаль літаратурная беларуская мова. І сястра Гандзя, якая прыехала са Слупска — вельмі сардэчны чалавек. Мяне ўразіў бларускі чалавечы архетып, прыгожы, далікатны, даверлівы. І шчыры. Тут канцэнтравалася ўсё тое што ў яго паэзіі.

З другога боку балела душа ад неадпаведнасці знешняга ладу жыцця і ўнутранага патэнцыялу паэта. Хацелася б, каб Валодзю жылося лягчэй. Каб у яго жыцці было больш радасці. Аднак, нягледзячы на цяжкасці, чорныя дні, я пад вялікім уражаннем як ён пражывае свой лёс. Ён верны сваім бацькам, свайму кутку і нацыянальным каштоўнасцям. Прытым ён не дэкларуе гэтага, а проста сваю вернасць выяўляе ў кожным паэтычным радку. Так, яго паэзія гэта — вернасць.

Ля парога паэта. Стаяць злева: Ян Чыквін, Уладзімір Гайдук, Альжбета Марчук, Галіна Тварановіч, Люба Марчук, Міра Лукша

— Людзі чытаюць прыгожы зборнік „Полымя роднае" і думаюць: усё добра, прыгожа...

— Творчасць Уладзіміра Гайдука, як жыццё — поліфанічная, яна не пазбягае мінорных адценняў. Але ў цэласці яна прасякнутая аптымізнам, бо паэт верны свайму спаконнаму, нацыянальнаму. І ён з'яўляецца хрысціянінам. Веруючы чалавек не можа быць песімістам.

— У адмаляванай на блакітны колер кухні, у покуце падараваная Вамі ікона Ефрасінні Полацкай. Яна прыехала з Вамі з Беларусі?

— Не, ікона напісана ў Гайнаўцы братчыкам Маркам Якімюком, шчыра захопленым беларускай святой. Мне, увогуле, вельмі прыемна, калі падарунак носіць духоўны характар. Я веру, што Гасподзь Бог дзейнічае праз людзей, што ён прывёў мяне ў гэтае месца і пазнаёміў з асобай паэта.

— Скажыце як паэт, спецыяліст па літаратуры: ці знаходзіце аналог у беларускай літаратуры для Уладзіміра Гайдука?

— Няма. Я часта над гэтым задумоўваюся. Няма такога другога паэта ў беларускай літаратуры, які бы тыпалагічна адпавядаў Уладзіміру Гайдуку, паэту-селяніну. Я сама пад вялікім уражаннем ад яго асобы як чалавека. Рэдка калі спатыкаеш чалавека такой шчымлівай уражлівасці, духовай чысціні.

— Ці чытачы і паклоннікі могуць чакаць прэзентацыі выдадзенага „Белавежай" да юбілею паэта „Полымя роднага"? Зразумела, з удзелам аўтара?

— Тут трэба падумаць. З-за шматлікіх абавязкаў заўсёды нам не хапае часу.

— Можа варта тут ангажаваць маладых сяброў „Белавежы"?

— Добрая ідэя, падумаем..

— Ад сябе дзякую Вам за апеку і новую кніжку Валодзі Гайдука.

—Цяпер, калі ў Валодзі тэлефон, нам лягчэй быць на кантакце. А як жа недапамагчы чалавеку, калі ў яго які клопат?

Кніга Яна Максімюка

Кнігу пад назовам «Словы ў голым полі» ў кнігарні выдавецтва «логвінаЎ» прэзентаваў беластоцкі аўтар і перакладчык Ян Максімюк.

Тэксты напісаныя ў розныя гады, прысвечаныя разнастайным асобам ды з'явам, звязаным з Беларуссю, былі сабраныя пад адну вокладку дзякуючы прапанове сябры аўтара, паэта і філосафа Ігара Бабкова.

— З канца 80-х, пачатку 90-х ён прыязджаў у Мінск і фармавалася гэтае пакаленне „тутэйшых". У пэўны момант мы проста зразумелі, што лепшага сведкі, які бачыў у той час побач, можа ў нас і не будзе. Тады я аднойчы яму пазваніў і сказаў, што хацеў бы бачыць гэтую кнігу.

Кніга „Словы ў голым полі" ўключае літаратурна-крытычныя эсэ і ўспаміны, напісаныя Янам Максімюком як 10-15 гадоў таму, так і зусім нядаўна. Выйшла яна ў серыі „Галерэя Б". У мінскай прэзентацыі выдання ўдзел узялі Адам Глобус, Уладзімір Арлоў, Сяргей Шупа, Ігар Бабкоў ды іншыя. Невялічкая зала кнігарні выдавецтва «логвінаЎ», дзе і праходзіла імпрэза, ледзь змясціла ўсіх жадаючых наведвальнікаў, што стала прыемнай неспадзяванасцю, заўважыў Ян Максімюк.

— Я ў Беларусі не быў ужо 15 гадоў і прыехаў у Мінск даволі ўзрушаны, усё гэта склалася разам з гэтай сустрэчай. Такое даволі пазітыўнае ўражанне. Я пабачыў сяброў, знаёмых, якіх не бачыў 15 гадоў, і наогул я задаволены гэтай сустрэчай, а ў першую чаргу задаволены тым, што ў Мінску выйшла мая кніжка.

Абмеркаванне эпохі, адлюстраванай у кнізе, ды самога выдання цягнулася больш за дзве гадзіны. Цяпер прэзентаваная кніга «Словы ў голым полі» беластоцкага аўтара Яна Максімюка дасяжная для чытачоў у кнігарнях Беларусі.

Аляксей Красоўскі, Радыё Рацыя, Мінск.

Мікола ВАЎРАНЮК

Пра аўтахтонаў і турыстаў

„Баімся, што згіне наша вёска, нашы традыцыйныя смакі, звычаі, — гаворыць серб Нэнад, спатканы Ілонай Карпюк („Балкан-экспрэс. Экскурсія № 1; „Ніва" ад 11.09.2011г.) у цягніку ў Чарнагорыю. Аўтарка баіцца таксама. Баіцца, што Сербія, калі ўвойдзе ў Еўрапейскі Саюз, згубіць свае непаўторныя смакі і пахі: „Пакуль Сербія не ў саюзе з Заходняй Еўропай, нагадвае яна Беларусь, багатую на свае аўтэнтычныя і характэрныя смакі ды стравы. Польшча ўжо так не пахне".

Чытаючы гэтыя радкі ўспомніў я маю зямлячку, святой памяці Валянціну Франкоўскую, выдатную спявачку, расказчыцу, шматгадовую кіраўнічку фальклорнага гурта „Тыневічанкі". Колькі яна старых песень ведала і як спявала! Як любіла нашы народныя традыцыі! Аднак яна, у адрозненне ад нас — пакалення яе дзяцей і ўнукаў — тыя „традыцыі" спазнала на сабе. І аднойчы ў Беластоцкім радыё сказала больш-менш так: „Песні мы спявалі прыгожыя, стараліся жыць весела, але калі аглянуся назад і ўсё ўспомню, то няхай згарыць той час, у якім я радзілася і дарастала, з яго бядою, вечнай нястачай, непасільнай працай, блыхамі і вошамі. Каб цяпер каму казаць апрануць саматканыя кальсоны, то і гадзіны ў іх не пахадзіў бы. Каб раз абцёр ср...у, больш бы на іх не глянуў". Разумная была жанчына.

Наш, умоўна кажучы, „маладабеларускі" рух у 80-ыя гады мінулага стагоддзя ўзяўся таксама з бунту супраць вышываных сарочак і лапцяў, у якіх хацелі нас бачыць іншыя. Не скажу, каб самыя па сабе вышыванкі былі брыдкія. Наадварот — яны вельмі фотагенічныя, што энтузіястычна скарыстоўвалі фотарэпарцёры, тэлежурналісты ці проста турысты падчас розных нашых фальклорных мерапрыемстваў. Але ж мы наштодзень не хадзілі ўжо басяком за плугам, а ў джынсах і снікерсах па вуліцах Беластока, Варшавы ды іншых гарадоў. Не цікавіла нас роля арыгінальных і каларытных аб'ектаў даследавання. Мы жадалі быць у жыцці суб'ектамі, самі здольныя здымаць і даследаваць. Прынамсі маё жаданне, на шчасце, збылося.

Я таксама люблю Сербію, а яшчэ больш Беларусь. Але маім сябрам з Мінска ці Гародні ў вочы глянуць не мог бы, калі б з увагі на мае любімыя вулічныя пункты продажу чабурэкаў ці там-сям яшчэ даступныя бочкавозы з квасам, хацеў закансерваваць Рэспубліку Беларусь такой, якая яна цяпер. Паехаць туды заўсёды прыемна: чысціня на вуліцах, ветлівыя людзі, танная гарэлка. Але нам ёсць куды вярнуцца. А маім сябрам там жыць і працаваць. За зарплату ў некалькі разоў меншую за нашую, еўрасаюзную.

Калі серб Нэнад баіцца, што Еўрасаюз сапсуе смак яго памідораў — яго права. Аднак, калі мы — „поўныя еўрапейцы" — падтрымліваем яго страх, бачу ў гэтым элемент эгаізму. Добра мець пад бокам экзатычную краіну, прычым такую, дзе памідоры ў некалькі разоў таннейшыя за еўрасаюзныя. Нічога дзіўнага, што яны саладзейшыя, больш сочныя і духмяныя.

P.S. *Рэпартаж цікавы. З нецярпеннем чакаю працягу балканскіх вандровак сям'і Дамброўскіх.*

Віктар ШВЕД

Дзмітрыю Шатыловічу ў 85

Імчаць гады, і немагчыма
Іх супыніць і паўстрымаць.
Табе таксама, мілы Дзіма,
Мінула восемдзесят пяць.

Здаецца, так нядаўна быццам
За партамі сядзелі мы
І пільна пачалі вучыцца,
Кніжак гартаючы тамы.

І шліфавалі сваю мову,
Шырокі пазнавалі свет,
Каб з досведам абявязкова
Выконваць кроўны запавет:

Народ свой усхваляць, айчыну,
Зямельку нашу ад вякоў,
І мову родную, што гіне
У рэчышчы суседніх моў.

Табе жадаю, дружа Дзіма,
Здароўя, шчасця ў Юбілей,
Хоць шмат гадочкаў за плячыма,
Жыві, пішы нам надалей!

Беласток, 8 верасня 2011 г.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Не маглі дачакацца ўрокаў!

У папярэдніх нумарах „Зоркі” мы пісалі пра дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову ў беластоцкай „чацвёрцы”. За гады працы школа прыдбала добры брэнд. З першага па шосты клас мову вывучае аж 75 дзетак!

Другая па ліку нашых навучэнцаў — Непублічная школа імя Кірылы і Мяфодзія. З года ў год тут усё больш дзяцей. Першай мовай сярод нацыянальных меншасцей (тут яшчэ навучаюць украінскай і рускай) — беларуская. Яе вывучае аж 47 дзетак, што ў агульным ліку складае каля трох чвэрцяў усіх вучняў.

— Нашы дзеткі такія цудоўныя, — хваліць сваіх гадунцоў настаўніца Іаанна Марко, — яны ў першы дзень школы падбягалі да мяне і расказвалі пра беларускія святы, на якія ездзілі ў час канікул з бацькамі. Адчувалася, што яны не могуць дачакацца ўрокаў. Я таксама за імі засумавала, таму ў вольны час распрацавала для іх ужо праграму на цэлы год!

Разам з пачаткам новага года ў школе новыя выклікі, між іншым праца і сустрэчы з „Зоркай”. **(гак)**

З вучнямі праваслаўнай школы

(падляшская легенда)

Гара, якая звоніць на Вялікдзень

У ліку найбольш вядомых легенд на Падляшшы — легенды пра цэрквы, якія праваліліся пад зямлю. Нярэдка з грэшным народам у сярэдзіне. Усё з-за грахоў, праклёну, камбінацый. Нашыя людзі набожна жагнаюцца ў падобных месцах. Кажуць, што ў Вялікдзень, калі прыкласці ў такім месцы да зямлі вуха, чуваць бой званоў.

Падобная легенда прыпісана Курашоўскай гары, што непадалёк мястэчка Нарва. Гару называюць яшчэ Курган. Сёння туды не прайсці, не праехаць. Колішнюю дарогу, якая пачыналася за агароджай новай школы, парос двухметровы трыснёг. Але адважныя людзі, і мы ў гэта верым, не звяліся ў народзе. Можа хто з вас намерыцца пайсці ў тое месца і ўсё праверыць. Ды калі не пачуе званоў, хай прыстане, паслухае „спеву” дубоў, якія спакон вякоў стаяць на крутым беразе ракі Нарвы.

Даўно-даўно там існаваў багаты пасёлак. Курашоўцы займаліся перапраўай падарожнікаў, што ездзілі з Кароны ў Княства Літоўскае або наадварот. Пасёлак наведвалі каралі і рыцары, заморскія купцы і паломнікі. Перад тым, як падацца ў далейшую дарогу, яны часта спыняліся ў гарадзішчы і адпачывалі. У адзін летні дзень у Курашава завітаў вяльможа з самога Полацка. Уражаны гасціннасцю людзей, вырашыў аддзячыцца і спансаравацъ новыя званы ў старую царкоўку, што высілася пасярод гарадзішча. Праз два гады, на вясну, даставілі ў Курашава новыя званы. Першы раз загаманілі яны ў Вялікдзень. Людзі стаялі як укапаныя ды слухалі іх чароўнага гучання. Па сэрцы быццам мёдзік разліваўся. Але як кажуць: там дзе прыгажосць — туды адразу зайздрасць прэцца.

У адну ноч званы зніклі. У суседняй Нарве, якая заўсёды канкуравала з Курашавам за прэстыж, ужо заранёў распусцілі чуткі. Нібыта там заказалі новыя званы ў царкву.

У наступны Вялікдзень, у Нарве, мелі асвячаць новыя званы. Сабраўся народ. Але тут сталася нешта страшнае. Колькі б званар не біў у звон — ён маўчаў і маўчаў. Пасля голасна прастагнаў і разарваўся на дзве паловы. Вестка пра анямелы звон маланкай разышлася па наваколлі. А тым, што дапусціліся пакражы, не было месца на зямлі. Ім сніліся ўсё кайданы, краты, шыбеніцы... Ведзеныя змрочным прадчуваннем, яны сустрэліся ў адну ноч і знялі званы, каб утапіць іх у самай глыбокай яме ракі. Але званы не замоўклі!

Людзі кажуць, што ў Вялікдзень, калі пайсці на Курашоўскую гару, адтуль, з глыбі тоні, пачуеце цудоўныя званы, якія калісьці падарыў добры чалавек з Полацка.

Від з Курашоўскай гары

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вершы Віктара Шведа

Малы моль

З шафы вырваўся моль,
Зведаў цэлую хату.
Паляцеў аж пад столь,
Зноў вярнуўся да таты.

Спытаў бацька: — Як свет
Падабаўся сягоння?
— Жыхары мне у след
Білі брава ў далоні!

Як жа мы раскалыхалі!

Праз рачны масток драўляны
Бег матутны слон.
Быў мост надта расхістаны,
Ледзь не рынуў ён.

На слані блыха дрыжала,
Сказала наўпрост:
— Як жа мы раскалыхалі
Гэты стары мост!

Праца з хворымі дзецьмі прыносіць многа радасці і энергіі

З Уршуляй Мазур, валанцёркай на Аддзяленні анкалогіі ў Дзіцячым клінічным шпіталі, гутарыць Уршуля Шубзда

Уршуля Шубзда: — *Адкуль такое рашэнне каб стаць валанцёрам?*

Уршуля Мазур: — У маёй сям'і некалькі асоб хварэлі ракам, між іншым мая хросная матулька. Я тады пачала бліжэй цікавіцца тэмай. Тады прыйшла думка, каб дапамагаць хворым дзецям, несці ім псіхалагічную падтрымку, адцягнуць ад штодзённай рэчаіснасці ў шпіталі.

— *Ці проста дапамагаць у месцы, дзе накапілася столькі пакут і хворых людзей?*

— Многія мяне пра гэта пытаюць. Думаю, што для мяне лягчэй па такой прычыне, што я ўжо раней глядзела на пакуты блізкай для мяне асобы.

— *Твае падапечныя, дзеці з якімі Ты сустракаешся на анкалогіі, ведаюць пра сваю хваробу, пра тое што гэта значыць?*

— Мне здаецца, што ведаюць. Калі паміраюць адны дзеці, іншыя пытаюць: што з імі здарылася, дзе знікла іх сяброўка ці сябар. Я пазнаёмілася з дзяўчынкай, якая прайшла хіміятэрапію. У яе доўгія валасы, якія пачалі выпадаць. Я мушу патлумачыць ёй чаму з раніцы на яе падушцы ляжыць столькі валасоў.

Дзеці пытаюцца ці яны памруць і тады трэба ім штосьці адказаць. Аднойчы на такое пытанне я адказала: кожны калісь памрэ. Пасля мне сказалі, што так нельга гаварыць дзіцяці. Трэба яго заахвоціць да гутаркі, запытаць чаму яно думае так а не інакш. Тады дзіця пачне гаварыць, яно адкрыецца на цябе, яму пасля будзе лягчэй.

— *Як стаць валанцёрам?*

— У Беластоку, у Дзіцячым клінічным шпіталі, арганізуюць курсы для валанцёраў, якія хочуць працаваць з хворымі дзяцьмі. На пачатку сустракаешся з псіхолагам, які перадае шмат тэарэтычных ведаў. Пасля трэба тры разы схадзіць на аддзяленне. На канец трэба прайсці тэст. Для мяне было цяжка пасля трэцяй сустрэчы з дзяцьмі, таму што яны ставілі мне цяжкія пытанні. Тады я зразумела што яшчэ многаму трэба навучыцца.

— *Як быць добрым валанцёрам?*

— Найважнейшая справа — быць сістэматычным, дзеці заўсёды ведаюць калі прыходзіць валанцёр. Трэба быць адказным, таму што дзеці чакаюць цябе, а ты не можаш іх падвясці.

— *Ці кожны можа стаць валанцёрам?*

— Кожны. Мне спачатку здавалася, што я не дам рады, не змагу, Але ўжо займаюся гэтым другі год. Магчыма, калі глядзець звонку, мая праца можа здавацца страшнай і прыгнятальнай, але ёсць інакш. Для мяне праца з хворымі дзяцьмі прыносіць многа ўнутранай радасці і энергіі.

Уршуля Мазур

— *Апрача валанцёрства, займаешся ў моладзевым тэатры «Кляпс», таксама ў гэтым годзе будзеш пісаць атэстат сталасці. Ці ёсць у Цябе час на гульні і сустрэчы з сябрамі?*

— У мяне цэлы час кантакты з людзьмі, ці гэта на анкалогіі, ці гэта ў тэатры. Дзякуючы заняткам я сустрэла вельмі якасных людзей.

— *Твае планы на будучыню?*

— Хачу добра здаць атэстат сталасці а пасля паступіць у Тэатральную акадэмію. Калі не атрымаецца, паспрабую паступіць на псіхалогію. Веру, што ў будучыні здзейсню свае мары каб заснаваць фонд, які будзе дапамагаць хворым дзецям.

Музыка з кайфам

Мега-песні

Восем гадоў інтэнсіўнай працы, новы партал, мноства выпрамаваных песень, гуртоў ды мерапрыемстваў. *Тузін Гітоў* гэта не толькі тузін прапаноў, але гэта тузін ідэй кожны дзень, ідэй наконт таго, як распаўсюджваць музыку беларускіх гуртоў ды беларускае слова.

Пра большасць праектаў *Тузіна Гітоў* распавядаю ў *Музыцы з кайфам*, але зараз хачу спаслацца на першую цырымонію ў гісторыі існавання гэтай актыўнай, насычанай інфармацыяй крыніцы ведаў пра беларускую сцэну.

У мінулую пятніцу ў папулярным мінскім клубе „Графіці" прайшоў канцэрт у рамках праекта „Жывы Тузін "і хаця ўжывую не прагучала лепшая дванаццатка адабраная ў галасаванні інтэрнэт-слухачоў, то характар мерапрыемства і канцэртная праграма выглядалі як сапраўдны юбілей. Сярод выступоўцаў варта адзначыць „Жнюв", гурт, які доўга змагаўся за галасы слухачоў у апошнім мега-туры. Паслухаць можна было „Акутэ", які ў адрозненні ад папярэдняга акустычнага канцэрта ў рамках „Жывога Тузіна" прэзентаваў праграму з новага альбому „Дзевачкі і космас" у арыгінальным гучанні. Быў і замежны госць. Украінскі гурт „Фіолет" прыехаў не толькі таму, што прэзентаваў на *Тузіне* песню на беларускай мове, а таксама таму, што паважае шмат каго на беларускай сцэне і захацеў, між іншым, пры такой нагодзе сустрэцца з беларускімі сябрамі. Зоркай вечара можна бы назваць „Ляпіс Трубецкой", але як сказаў мне супрацоўнік партала Аляксей Мінчонак, тут няважнае, хто перамог — гаворка пра ідэю сустрэчы, ды важнае, каб дацэненымі адчувалі сябе ўсе, хто трапіў у мега-тур.

Варта прызнаць рацыю Мінчонку, асабліва таму, што ў час мерапрыемства паявіўся падляшскі акцэнт. Спіс тузіна выканаўцаў, якіх адзначылі слухачы, закрыў гурт „ILO&friends" з песняй „Сланечнікі". Дванаццатае, але ў кантэксце цэлага галасавання вельмі важнае месца! Можа будзе гэта чарговы штуршок, каб у Беларусі шырэй слухалася музыка падляшскіх беларусаў.

http://www.euroradio.fm

Сабраныя ў клубе ўдзельнікі вечарыны маглі таксама першымі пабачыць новы выпуск альбома „Прэм'ер Тузін ", а песень з гэтага альбома напэўна можаце паслухаць на хвалі Радыё Рацыя, перш за ўсё ў праграме-радыёверсіі *Тузіна Гітоў*, якую вядзе Алег Хаменка (лідар „Палаца"), а таксама і ў „Словах з музыкай".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 39

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 35:

Міф, кава, сказ, гарбата, гарбуз, арка, канва, адвага. Брат, маг, вагон, мара, брава, абрад, сук, каша, дзічына.

Узнагароду, фільм пра беларускія абрады Масленіцу, Купалле, Вялікдзень выйграла **Юстына Вакулюк** з Гайнаўкі. Віншуем!



ВІНШУЕМ

Барбара Пякарская і Дарафей Фіёнік узнагароджаны Срэбным Крыжом Заслугі

Злева: Люблінская ваявода Геновефа Такарска і Барбара Пякарская.

Срэбныя Крыжы Заслугі былі ўручаны шэрагу дзеячоў нацыянальных ды этнічных меншасцяў у Польшчы. Сярод узнагароджаных — старшыня Музея Малой Айчыны ў Студзіводах Дарафей Фіёнік і старшыня Аб'яднання бацькоў АБ-БА Барбара Пякарская. Рашэнне пра ўзнагароджанне падпісанае Прэзідэнтам Польшчы Браніславам Камароўскім.

Барбара Пякарская — *Я гэтую ўзнагароду разумею як узнагароду для цэлага нашага асяроддзя, якое працуе ў карысць адукацыі ў Беластоку. Адукацыя, якой яшчэ гадоў 16 таму не было зусім у нашым горадзе, а сёння маем садок, у які трэба добра пастарацца, каб трапіць, дзве пачатковыя школы, гімназію, ліцэй, у якіх дзеці і моладзь могуць вывучаць беларускую мову.*

Барбара Пякарская адзначае, што ўсё дасягнутае не было б магчымым без бацькоў, якія аддаюць сваіх дзяцей на беларускае навучанне і без такіх настаўнікаў, як Аліна Ваўранюк ды іншыя.

Узнагароджанне адбылося ў рамках Міжнароднай канферэнцыі нацыянальных, этнічных і моўных меншасцяў, якая прайшла ў Любліне 14-16.09.2011 г.

Яна Запольская, Радыё Рацыя.

Гмінная статыстыка

Наведаў я Гмінную ўправу ды пацікавіўся статыстыкай. Пры канцы жніўня ў Чаромхаўскай гміне пражывала 3 518 чалавек. Самай старэйшай асобай лічыцца Яніна Бычкоўская са станцыі Чаромха, народжаная ў 1913 годзе. Бабульцы 98 год. На год малодшая жыхарка Зубачоў Ніна Мусюк — яна 1914 года нараджэння. А яе аднавяскоўка Марыя Аліфярук пражыла 93 гады. Пятру Зіневічу з вёскі Чаромха і Валерыі Міхальскай са станцыі Чаромха — 91 год. У групе дзевяностагодкаў (1921 года нараджэння) апынулася 5 асоб, а 48 жыхароў неўзабаве дасягне гэтага ўзросту. Сёлета 85-гадовы юбілей адзначае дваццаць жыхароў гміны.

А дзесяць гадоў таму (стан на 31 студзеня 2001 г.) на тэрыторыі гміны пражывала 4 042 чаавек. За дзесяцігоддзе паменшала нас на паўтысячы чалавек. Больш людзей памірае, чым нараджаецца. Да канца ліпеня г.г. зарэгістравана 10 народзін і 14 шлюбаў, а памерла 15 асоб. У мінулым годзе лік памерлых склаў 44 асобы, калі ў 2009 годзе адышлі ў вечны спачын 28 чалавек.

Уладзімір СІДАРУК

Іван СУХОЦКІ

Нашы песні больш душэўныя

Сёлета 18 чэрвеня споўнілася сто гадоў з дня нараджэння, а 26 верасня споўніцца дзевяць гадоў з дня смерці кампазітара Аляксандра Канстанцінавіча Шыдлоўскага. Адна песня „Колькі ў небе зор" зрабіла яго вядомым кампазітарам не толькі ў Беларусі, але і далёка па-за яе межамі. Мне шмат разоў прыходзілася пабываць у Маскве, сустракацца з людзьмі розных нацыянальнасцей і калі збіраемся кампаніяй у гасцінічным нумары, у нас, беларусаў, прасілі паспяваць што-небудзь наша, народнае. І мы заўжды пачыналі спяваць песню „Колькі ў небе зор". Усе неяк сцішана, задаволена слухалі чароўную мелодыю беларускага вальса. Слухачы прасілі перапісаць тэкст гэтай песні, а мелодыя заставалася ў іх памяці. Зараз у нас у Беларусі ніводная вечарына, юбілей ці нарадзіны альбо вяселле не праходзяць без гэтай песні-вальса. Дарэчы, мне ў сваім жыцці пашчасціла часта сустракацца з гэтым чалавекам. Яго статная, высокая фігура, шырокія плечы, высокі сакратаўскі лоб, упэўненая паходка заўжды звярталі ўвагу прахожых людзей там, дзе ён з'яўляўся ў горадзе ці ў вёсцы.

З Аляксандрам Канстанцінавічам я асабіста пазнаёміўся ў Ашмяне, недзе ў сярэдзіне сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя на раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці. Ён у тыя часы калясіў па ўсёй вобласці, шукаў таленавітых выканаўцаў. Калі ашмянскія дзяўчаты і хлопцы выйшлі гуртом на сцэну, выканалі некалькі народных песень, у яго загарэліся вочы, прабегла няўлоўная ўсмешка на твары. Ён пасля выступлення пахваліў выканаўцаў за паспяховы дэбют. Пасля часцяком прыязджаў у Ашмяну, аказваў дзейсную метадычную дапамогу маладому калектыву. Хутка наспела патрэба назваць гэты самадзейны калектыў. Мясцовыя культработнікі доўга думалі, спрачаліся наконт назвы калектыву. І тут у гаворку ўмяшаўся Шыдлоўскі, доўга не думаючы сказаў: „Я ведаю, што на Ашмяншчыне шмат рачулак, а яны свой шлях пачынаюць з гаючых крынічак. То давайце назавем ваш ансамбль „Крыніцы". Усе пагадзіліся з прапановай кампазітара. Праз некалькі гадоў ансамблю міністэрства культуры рэспублікі прысвоіла званне народнага калектыву. Пазней, калі мяне перавялі працаваць у абласны цэнтр, прыйшлося часта сустракацца з гэтым чалавекам. Высокая культура ў рабоце, энцыклапедычныя веды, настойлівасць ў падняцці мастацкай самадзейнасці, напісанне новых песень — усё гэта прыносіла станоўчыя вынікі. Гродзеншчына на рэспубліканскіх аглядах па мастацкай самадзейнасці заўжды займала першае ці другое месцы. Мне надоўга запамяталася гутарка з Шыдлоўскім пасля абласнога агляду мастацкай самадзейнасці 1998 года. Кампазітар паскардзіўся, што зараз няма той самадзейнасці, якая раней была. „У асноўным выступаюць прафесійныя калектывы. А той фальклорна-аўтэнтычнай самадзейнасці няма. Шмат мы каштоўнага, спрадвечнага губляем, магчыма, назаўсёды. Аб гэтым душа мая баліць. З усіх выступленняў толькі са Свіслачы дзве жанчыны — Ніна Ярош і Вольга Дарошына выканалі народныя песні перададзеныя нашымі дзядамі і бацькамі. Нашы песні больш душэўныя чым у іншых народаў. Добрае ўражанне паказалі „Карэліцкія танцы", якія насілі абрадавы характар. А так усё нецікавае, шэрае, бязлікавае, попсавае". У звязцы пайшла гаворка аб яго асабістым жыцці. Сваю любую жонку Барбару Яўхімаўну пахаваў у 1981 годзе. Зараз жыве з дачкой і ўнукамі. Другая дачка выйшла замуж за беларуса з Беластока, дзе сам Аляксандр Канстанцінавіч у маладосці пражываў. Шыдлоўскі не абмяжоўваўся кампазітарскай работай і мастацкай самадзейнасцю. Яго хваляваў далейшы лёс нашай краіны, яе гісторыі, культуры і мовы. Доўгія прошлыя гады, сустрэчы і асабістыя знаёмствы з волатамі нацыянальнага адраджэння: Дварчанінам, Забейдам-Суміцкім, Рыгорам Шырмам, Максімам Танкам адклалі моцны адбітак на ўсё яго жыццё.

Аднойчы іду пасля работы дадому па ціхай вуліцы, у старым цэнтры горада Гродна. Насустрач ідзе Шыдлоўскі. Павіталіся цёпла, паціснулі адзін аднаму рукі. Імжыць дробны дождж, неба нахмарылася. Аляксандр Канстанцінавіч апрануты па-летняму: на галаве белая кепка, нагавіцы светлыя, у шэрым летніку. „Адкуль вы шыбуеце?" — спытаўся я. „Цягнуся з паліклінікі, што па вуліцы Ватуціна. Там абслугоўваюць ветэранаў вайны і працы. Нешта вочы падводзяць. Ведаеце, трохі закапалі, злёгку палягчэла". Пайшла размова на іншую тэму. Нейкім невясёлым тонам кампазітар прамовіў: „Ведаеце, дарагі калега, ужо адзіны беларускі ліцэй у Мінску закрываецца. Бачыце, што робіцца з нашай мовай. Усё зноў пераходзіць на старыя рэйкі". Наступіла кароткая паўза. Каб падняць настрой у субяседніка, звяртаючыся да яго, я сказаў: „Паважаны Аляксандр Канстанцінавіч, мова жыла і будзе жыць. Моладзь зараз да яе цягнецца. Сёння я купіў у кнігарні цікавую кніжку „Геральдыка беларускіх местаў" Анатоля Цітова. Унікальная кніга. У канцы кнігі змешчана этнаграфічная карта, якую склалі вядомыя моваведы Яўхім Карскі і Мітрафан Доўнар-Запольскі. Частка насельніцтва Смаленчшыны і Браншчыны размаўляла раней на нашай мове. А вазьміце расейскую мову, там амаль палова беларускіх слоў. Нядаўна мне расказвалі землякі: у час жніва на Смаргоншчыну прыехаў першы намеснік прэм'ер-міністра БССР Хусаінаў, па-нацыянальнасці татарын. Дзяўчаты ў нацыянальных строях прыпаднеслі яму каравай з кветкамі. Прымаючы каравай, Хусаінаў сказаў, гледзячы на Кляцкова: „Якія ў вас прыгожыя дзяўчаты". А той у жартаўлівай форме адказаў: „Ведаш чаму? Сюды да нас не дайшлі татарскія ваяры ў час нашэсця Чынгісхана". Самая чыстая са славянскіх моў гэта наша беларуская. Яна вызначаецца прастатой, пявучасцю, чысцінёй, самабытнасцю. За мову трэба змагацца штодзённа, настойліва". І прывёў цікавы прыклад. Запрасіў калісьці на 50-годдзе перамогі над фашысцкай Германіяй нас з хорам старшыня калгаса „Перамога" Бераставіцкага раёна Маханько, заядлы прыхільнік беларушчыны. Быў сход у клубе, сабралася шмат людзей, цёпла віншавалі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Паказалі канцэрт і выступленні гродзенскіх паэтаў і кампазітараў: Янкі Насуты, Апанаса Цыхуна, Марка Копа, Яўгена Петрашэвіча. Затым запрасілі нас у сталоўку на вячэру. Там усе выступалі на беларускай мове. Толькі старшыня сельскага савета выступіў на рускай мове. Гэта моцна ўзбудзіла нашага паэта-песенніка Янку Насуту, што той не стрымаўся і сказаў, звяртаючыся да старшыні сельскага савета Курылы: „Вы ўлада і не ведаеце роднай мовы. Каб я ведаў, што вы так робіце, то нават не сеў бы з вамі за адзін стол". Сканфуджаны старшыня сельскага савета пачаў няёмка апраўдвацца, прасіць прабачэння. Вось, каб так мы рабілі ўсе, то нацыянальнае пытанне даўно было б вырашана. А так мы боўтаемся ў сажалцы і не можам вылезці адтуль".

Апошні раз я сустрэў Шыдлоўскага летам 2002 года на Савецкай плошчы. Пастаялі, пагутарылі. „Ездзіў у Паўднёвы пасёлак, у аптэку за імпартнымі лекамі, — неяк глухаватым голасам адказаў ён. — Нешта прастыў, хрыпата ў грудзях". Вядомы творца моцна схуднеў. „Аляксандр Канстанцінавіч! Я толькі што на днях вярнуўся са Смаргоні, вашай радзімы", — паведаміў я яму. „Ну, зараз, хто там галава раёна?" — „Кавалёў Мікалай Мікалаевіч. Жыхары хваляць, што добры і кіраўнік, і чалавек. — „А Соня? Там узначальвае культуру?" — ціха спытаўся кампазітар. — „Даўненька яна там працуе, і плённа. Яна з Місарэвічам Яўгенам высока паднялі ў раёне культуру".

Мы цёпла развіталіся з ім. Ён з цяжкасцю падняўся на ступенькі тралейбуса № 1, які накіроўваўся ў бок вуліцы Паповіча, дзе жыў слынны кампазітар.

Памёр Аляксандр Канстанцінавіч 26 верасня 2002 года. Пахаваны на могілках па праспекце Касманаўтаў побач з жонкай. На чорным мармуры высечаны словы: „Смерці не пад сілу забраць народную любоў".

Калі новыя падручнікі па беларускай мове?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Настаўнікі беларускай мовы, што спаткаліся ў белліцэі з метадыстам Іалантай Грыгарук (на першым плане справа) і дэпутатам Яўгенам Чыквіным (злева)

Ужо распачаўся чарговы трэці школьны год, калі настаўнікі беларускай мовы павінны працаваць з новымі падручнікамі (цяпер для першага, другога і трэцяга класаў падставовай школы і гімназіі), згоднымі з новымі праграмнымі падставамі і новымі праграмамі навучання, аднак карыстаюцца ў сваёй рабоце надалей старымі падручнікамі. Як дагэтуль, спроба выдаць перапрацаваны падручнік для навучання беларускай мовы ў другім класе падставовай школы закончылася паразай, хаця выйшлі з друку новыя падручнікі, якімі карыстаюцца вучні іншых нацыянальных меншасцей пражываючых у Польшчы. Міністэрства адукацыі заклікае нашых настаўнікаў падрыхтаваць да выдання патрэбныя ім падручнікі, але настаўнікам беларускай мовы не прад'яўляецца ніякай гарантыі, што менавіта іх падручнікі пасля паправак і дапрацавання будуць выдадзены. Да конкурсаў на выдаванне канкрэтных падручнікаў могуць прыступаць розныя выдавецтвы, іншыя ўстановы і прыватныя асобы, а міністэрства павінна выбраць самую лепшую загадзя падрыхтаваную прапанову. Пры гэтым нашыя педагогі, калі рашыліся б рыхтаваць падручнікі самастойна, павінны самі знайсці некалькі тысяч злотых і ўплаціць іх у міністэрыяльную касу, а таксама вымушаны былі б спачатку расходаваць свае грошы на падрыхтовачныя работы, між іншым на выкананне фатаграфій ці патрэбных рысункаў. Гэтыя расходы маглі б ад пачатку пагашаць выдавецтвы, якія раней ахвотна друкавалі падручнікі для навучання беларускай мовы, але яны таксама няпэўныя, ці прапанаваныя імі да выдання падручнікі адобрыць Міністэрства адукацыі. Прытым сродкі, якія могуць выдзяляцца з дзяржаўнага бюджэту на друкаванне малатыражных падручнікаў для навучання моў нацыянальных меншасцяў — скарацілі.

— Міністэрства нацыянальнай адукацыі патрабуе, каб мы вучылі паводле новых падручнікаў, але ёсць вялікія праблемы, каб выдаць гэтыя падручнікі, — гаварыў у размове з намі Яўген Сачко, дырэктар гайнаўскіх белгімназіі і белліцэя.

Я пацікавіўся гэтай праблемай і паразмаўляў наконт яе з настаўнікамі беларускай мовы.

— Асабліва складана працаваць у другім класе падставовай школы без „Літарынкі", дзе разам з падручнікам ёсць таксама месца на практыкаванні правільнага пісання. Практыкаванні, запоўненыя вучнямі ў папярэдніх гадах, непрыдатныя да карыстання, і таму для другога класа найбольш неабходныя новыя падручнікі. Менш праблем у час працы паводле новай праграмы навучання са старымі падручнікамі ў старэйшых класах, але старэйшым вучням таксама патрэбныя новыя падручнікі, — сказала адна з настаўніц беларускай мовы.

— Праект новай „Літарынкі" для другога класа падставовай школы падрыхтаваны супольна маёй мамай Ларысай Бурыла і мной ужо доўга ляжыць у Выдавецтвах школьных і педагагічных, бо гэтае выдавецтва патрабавала падрыхтаваць пераапрацаваны падручнік да сакавіка 2009 года і да гэтага часу новая „Літарынка" так і ненадрукаваная. Паінфармавалі нас у Міністэрстве адукацыі, што кошт выдання новага падручніка „Літарынка" паводле расцэнкі з ВШіП завялікі і папрасілі нас пашукаць іншае выдавецтва, якое згадзілася б выдаць гэты падручнік танней. Аднак мы не можам забраць з ВШіП праект падручніка дастасаванага да новых патрабаванняў і выдаць яго ў іншым месцы, бо спалучае нас з ВШіП дамова. Гэтае ж выдавецтва раней выдавала „Літарынку" (Ларыса Бурыла была яе аўтаркай — А.М.) і ў яго ўсе правы на стары падручнік, на падставе якога быў апрацаваны новы. Можна было б напісаць новы падручнік для другога класа ад падстаў, але няма гарантыі, што і гэты падручнік будзе выдадзены, — расказвала Аліна Ваўранюк, настаўніца беларускай мовы з Беластока (раней з бельскай „тройкі", дзе працавала таксама яе мама Ларыса Бурыла). — Мы выдалі свае грошы на падрыхтаванне праекта новай „Літарынкі" і нам ніхто іх не вярнуў. Магла б я рыхтаваць таксама праект новага падручніка для іншага класа, але хто выканае мне ілюстрацыі і хто праспансаруе іншыя расходы?

Метадыст па навучанні беларускай мовы Іаланта Грыгарук пры нагодзе арганізаванай 13 верасня гэтага года ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы канферэнцыі рашылася чарговы раз паразмаўляць у справе выдання новых падручнікаў з настаўнікамі беларускай мовы і запрасіць на спатканне дэпутата Яўгена Чыквіна, заадно прадстаўніка выдавецтва „Ортдрук", якое выдавала падручнікі для навучання беларускай мовы ў гімназіі. У час ранейшай размовы Іаланта Грыгарук паінфармавала нас, што між іншым ад імя настаўнікаў пісала ў справе цяжкасцей з выданнем новых падручнікаў у Міністэрства адукацыі і атрымала адказ, у якім чыноўнікі з міністэрства заахвочвалі настаўнікаў беларускай мовы ствараць праекты новых падручнікаў для навучання беларускай мовы, але не давалі ніякіх гарантый, што гэтыя падручнікі будуць выдадзены і не абяцалі ніякай фінансавай дапамогі ў пачатку выдавецкага працэсу. Калі вясной гэтага года ў гайнаўскіх белліцэі і белгімназіі пабывалі дэпутаты з Камісіі нацыянальных меншасцей, настаўнікі беларускай мовы з гэтай школы Іаланта Грыгарук і Ян Карчэўскі расказвалі пра клопаты з-за якіх нельга выдаць новыя падручнікі. Дэпутат Яўген Чыквін абяцаў хадайнічаць у Міністэрстве адукацыі ў гэтай справе і разгледзець у выдавецтве „Ортдрук" магчымасць падрыхтавання з дапамогай гэтага выдавецтва праектаў новых падручнікаў і прааналізаваць магчымасць іх выдання.

— Гражына Плашайская з Міністэрства адукацыі сказала мне, што калі мы ў гэтым годзе хутка падрыхтуем праекты новых падручнікаў, можна было б адкласці ў міністэрстве сродкі на іх выданне ў наступным годзе. Я думаю, што выдавецтва „Ортдрук" не ў змозе выдаць новыя падручнікі, але мог бы заняцца гэтым Фонд Канстанціна Астрожскага, Анна Радзюкевіч згадзілася ўжо быць рэдактарам гэтых падручнікаў. „Ортдрук" выдаваў 3 падручнікі для гімназіі, якіх аўтарам з'яўляецца Тамара Русачык, але не ведаю, ці яна згодзіцца заняцца папраўкамі да старых падручнікаў. У выпадку ліцэя можна было б таксама перавыдаць старыя падручнікі Фондам Канстанціна Астрожскага, а падрыхтаваць праекты маглі б аўтары старых падручнікаў, — прапанаваў сабраным настаўнікам у час сустрэчы ў белліцэйскім чытальным зале дэпутат Яўген Чыквін і дадаў, што Фонд Канстанціна Астрожскага не будзе ў змозе адразу заплаціць ганарараў аўтарам праектаў новых падручнікаў, але толькі тады, калі гэтыя падручнікі будуць адобраны Міністэрствам адукацыі і выдадзены. Дэпутат Чыквін прапанаваў таксама перагледзець дамовы паміж настаўнікамі і Выдавецтвамі школьнымі і педагагічнымі на выданне старых падручнікаў, каб спраўдзіць, ці педагогі маюць правы перавыдаваць свае падручнікі ў іншых выдавецтвах.

— Я асабіста гаварыла з Тамарай Русачык і яна гатова нанесці папраўкі да падручнікаў яе аўтарства, — сказала Іаланта Грыгарук. — Няма патрэбы шмат мяняць у старых падручніках, каб дастасаваць іх да новай праграмнай падставы, якая ёсць даволі агульнай.

— Як найхутчэй трэба было б выдаць падручнікі для гімназіі, бо яны больш неабходныя чым падручнікі для ліцэя (толькі з наступнага школьнага года ў ліцэях будуць абавязваючымі новыя праграмы навучання і новыя праграмныя падставы — А.М.), — гаварыў настаўнік гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі.

— Спадарыня Аліна Ваўранюк падрыхтавала вельмі цікавы праект падручніка апрацаванага на падставе „Літарынкі" і ВШіП не выдаюць яго і не хочуць аддаць гэтага праекта, каб можна было яго выдаць у іншым выдавецтве, а для наймалодшых дзетак новыя падручнікі найбольш патрэбныя, — напамінала сабраным Іаланта Грыгарук.

— Аўтарам падручніка для першага класа ліцэя з'яўляецца Вольга Сянкевіч, і мы можам спытацца ў яе, ці згодзіцца дастасаваць падручнік да новай праграмнай падставы, — сказалі настаўнікі гайнаўскага белліцэя. Метадыст Іаланта Грыгарук паінфармавала сабраных, што літоўцы выдалі ўжо 11 новых падручнікаў, згодных з новымі праграмнымі падставамі, украінцы — 7, а кашубы — 4. Цяжка зараз сказаць, ці ў гэтым школьным годзе, а ў наступным каляндарным будуць надрукаваны з выкарыстаннем сродкаў з Міністэрства адукацыі падручнікі для навучання беларускай мовы ў падставовай школе, гімназіі і ліцэі, хаця б па аднаму выданню для гэтых трох школаў, бо цяпер ёсць замнога нявысветленых праблем хаця б наконт аўтарскіх правоў ВШіП да старых падручнікаў. Калі б такія былі, то без згоды ВШіП аўтары падручнікаў не маглі б перавыдаць іх з дапамогай Фонда Канстанціна Астрожскага ў выдавецтве „Ортдрук", але ў такім выпадку мусілі б ствараць праекты новых падручнікаў ад падстаў. Педагогі маглі б пайсці на супрацоўніцтва з Выдавецтвамі школьнымі і педагагічнымі, але зараз невядома, ці Міністэрства адукацыі згодзіцца карыстацца паслугамі гэтага выдавецтва, калі яно не панізіць коштаў перавыдання старых падручнікаў для навучання беларускай мовы. Праблема можа хутка высветліцца, але можа таксама не крануцца з месца, па-за падручнікамі для гімназіі, якія раней выдаваў „Ортдрук".

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Што ў Чаромсе?

Дзесяты месяц паступіў, як змяніўся войт у Чаромхаўскай гміне. Многія чарамшане і жыхары навакольных вёсак спасылаліся на станоўчыя перамены ў карысць лакальнай грамадскасці, бо праграма, якую прадстаўляў на выбарчых сходах мясцовы кандыдат (да выбараў на пасадзе войта заставаўся 22 гады спадар Міхал Врублеўскі з Гайнаўкі), была цікавая ды шматабяцаючая. Зараз у народзе адчуваецца прысмак незадавальнення. Многія грамадзяне прад'яўляюць крытычныя заўвагі ў адрас некампетэнцыі чынушы. Праблема ў тым, што войт не збіраецца нічога пераменьваць у працы падпарадкаванага персаналу, паколькі, па ягонай думцы, гэта шматгадовыя і вопытныя работнікі. Рашыў я затым высветліць некаторыя праблемы, аб якіх пачуў ад сваіх суразмоўцаў.

З войтам Ежы Шыкулам сустрэліся мы ў панядзелак 13 верасня. У размове ўдзельнічалі скарбнік гміны Міраслава Кандрацкая-Найбук ды намеснік войта Ірыней Леанюк. Перш-наперш кранулі справу спартыўнага клуба „Калеяж", а канкрэтна кажучы фінансавай успамогі гміннымі датацыямі.

— На спорт сёлета прызначана ў бюджэце 88 247 зл., — паясніла скарбнік. — Гэтыя грошы прызначаны на два аб'екты: школьны стадыён „Орлік" і СКС „Калеяж". На першы вылучана 25 247 зл., з якіх аплачваецца двух апекуноў, кошт электраэнергіі і пакупку падручных рэчаў. Апошнімі карыстаецца футбольная камандa „Калеяж". З гэтай сумы прызначана 10 тысяч на зарплату трэнеру, 2 тысячы на куплю спартыўных рэчаў і 1 000 зл. на транспартныя паслугі. Адпаведна да мінулага года гміна прызначыла на спорт 8 196 зл. больш. Да гэтага года футбольнай камандай займаўся трэнер Лукаш Шабалоўскі з Беластока. Сёлета прайшлі выбары ў СКС „Калеяж". Прэзеса Ежы Яўдосюка заступіў Міраслаў Самасюк. Паводле прапановы новага праўлення, павінны ў СКС дзейнічаць дзве каманды. Аднаму трэнеру затым не справіцца з дзвюма камандамі. Прэзас М. Самасюк выступіў з прапановай прыняць на працу другога трэнера. Зараз футбалістамі займаецца трох трэнераў: Лукаш Шабалоўскі, Багдан Гансяроўскі і Каміль Кулік. Вызначаная сума 10 тыс. у год для трэнераў гэта невялікія грошы. Затым яны могуць адчуваць сябе пакрыўджанымі, бо прызначаная грашовая квота не выплачваецца аднаму, а для трох трэнераў. Варта адзначыць, што персанальныя змены не былі прадугледжаны ў сёлетнім бюджэце, — завяршыла спадарыня скарбнік.

Іншай справай было пагашэнне ільгот у сельскагаспадарчым падатку двум вядомым земляробам і прадпрымальніцы. І ў гэтай справе атрымаў тлумачэнне ад гміннага скарбніка.

— Прад'яўленым асобам не быў пагашаны сельскагаспадарчы падатак, — канстатавала спадарыня Кандрацкая-Найбук, — адно зварот акцызу за сельскагаспадарчае паліва. Такое тычыцца кожнага земляроба, які абрабляе гаспадарку. Варта заўважыць, што зварот акцызу тычыцца тых гаспадароў, якія маюць вызначаную стаўку больш чым 500 зл. акцызу. Затым малазямельныя гаспадары атрымліваюць адно зварот коштаў купленага паліва, а пры большых гаспадарках вяртаецца і кошт акцызу. Так было і ў выпадку пералічаных вамі земляробаў з Янцэвічаў і Кузавы. Паколькі прадпрымальніца з Чаромхі з'яўляецца ўладальніцай сельскагаспадарчых грунтаў, таксама належыцца ей зварот акцызу за паліва. Усё прадугледжана законам.

— А як справа маецца з рэалізацыяй гмінных інвестыцый? — пытаю ў войта. — На гэтае пытанне адкажа мой намеснік, — паясніў спадар Е. Шыкула. Затым Ірыней Леанюк, паклаўшы на пісьмовы стол некалькі размеркавальнікаў з кучай дакументаў, пачаў тлумачыць: — Асноўнай задачай, якою займаліся мы сёлета, было ўстараненне вырабаў, якія змяшчаюць азбест. Заявы паступілі з сорак дзвюх гаспадарак. У час рэалізацыі праграмы быў аб'яўлены аўкцыён на выкананне работ. Удзельнічала пяць фірмаў. Перамагла „Аўталом" Багуслава Пазя з Пшэвлокі, Свентакшыскага ваяводства. У агульным падліку было знятых сем тысяч кубаметраў вырабаў змяшчаючых азбест.

Не менш важнай інвестыцыяй, якую гміна рэалізавала, было здабыванне датацый ад маршалка Падляшскага ваяводства на куплю гідраўлічных прыбораў сярэдняга набору для добраахвотнай пажарнай каманды з Чаромхі-Вёскі. Квота 20 тыс. злотых была ўпершыню прызнана пажарнікам і з'яўляецца найбольшай сумай у Гайнаўскім павеце. Гэта каштоўны набор для ратавання пацярпелых у дарожных аварыях.

Рэалізуем задачу рамонту вясковай святліцы ў Кузаве. Пачатковая вартасць паводле каштарысу прадугледжвала суму больш за 313 тыс. зл. У час аб'яўленых таргоў удзельнічала пяць устаноў. Перамагла фірма Кшыштафа Болтрыка з Беластока, якая абавязалася выканаць работы за суму 228 821,39 зл. Рамонт будзе закончаны да канца года.

Быў адобраны праект і атрымалі мэтанакіраваную датацыю з запасу міністра рэгіянальнага развою на выкананне комплекснай шматгалінавай дакументацыі праектавай, будаўнічай, выканаўчай і каштарысавай, таксама адаптацыю часткі будынка пачатковай школы на патрэбы прадшколля. Кошт гэтай інвестыцыі складае суму 980 664 злотых.

У рамках урадавага праекта „Радас- працяг ☞11



Беларуская палітычная прастора адметная адсутнасцю на ёй моцных палітычных партый, якія б маглі паасобку значна ўплываць на грамадскую свядомасць і, адпаведна, змяняць беларускую палітыку. Усе намаганні беларускай апазіцыі, а менавіта там знаходзяцца хоць малыя, але самастойныя палітычныя арганізацыі, заканчваліся больш-менш значным поспехам тады, калі апазіцыянеры дзейнічалі сумесна. Разуменне вартасці агульных намаганняў прысутнічае ў беларускім апазіцыйным асяроддзі, праўда, далёка не заўсёды супольная дзейнасць застаецца паслядоўнай. На тое ўплываюць як ідэйныя адрозненні, так і амбіцыі партыйных лідэраў. Разам з тым спробы аб'яднацца ці стварыць нейкі агульны рух не спыняюцца.

Роўна пяць гадоў таму ў 36-ым нумары „Ніва" пісала аб сайце кампаніі „За свабоду", якая была свайго роду адгалінаваннем дзейнасці аднаго з кандыдатаў у беларускія прэзідэнты на выбарах 2006 года Аляксандра Мілінкевіча. Той сайт існуе і дагэтуль, але актуальных абнаўленняў на ім нябачна ўжо каля паўтара года. Затое даволі актыўна абнаўляецца сайт руху „За свабоду", што стаў свайго роду працягам аднайменнай кампаніі. Месціцца вэб-старонка грамадскай арганізацыі, якая заклікае далучыцца да яе ўсіх прыхільнікаў дэмакратычнага развіцця Беларусі, па адрасе **http://pyx.by**. Яго назва „За свабоду" ўжо стала брэндам Аляксандра Мілінкевіча. Гэты палітычны дзеяч не ўваходзіць ні ў якую партыю, але ўзначальвае даны апазіцыйны рух.

Адметна, што лагатып былой кампаніі — птушка, праўда, стылізаваная, таксама існуе ў руху. Гэты лагатып месціцца ў левым вугле выяўлення. Побач з ім — выйсці на іншыя старонкі сайта. Варта адзначыць, што галоўная старонка пабудавана даволі арыгінальна. Нягледзячы на нібыта дзяленне на дзве часткі, яна, па сутнасці, ёсць стужкай паведамленняў і артыкулаў. Каб прачытаць іх, трэба „клікнуць" на змешчаныя там загалоўкі. Таксама на галоўнай старонцы ідзе своеасаблівая прэзентацыя актывістаў руху — на асобных пазіцыях месцяцца іх партрэты і выйсці на датычныя гэтых асобаў артыкулы.

Выйсце да рубрыкі „Навіны" таксама пазначана на сайце. Яна змяшчае некалькі падрубрык, якія аддзяляюць, напрыклад, навіны Беларусі ад навін руху ці аналітычных матэрыялаў.

Не зусім зразумелым падаецца сэнс існавання рубрыкі „Мультымедыя". Згодна яе падрубрык яна падзяляе паведамленні з фота- і відэааздабленнямі. Насамрэч, і фота, і відэа месцяцца там разам з выключна тэкставымі нататкамі.

Адпавядае сваёй назве старонка „Рэгіёны", якая змяшчае навінныя паведамленні з шасці беларускіх абласцей і Мінска. Вартасць данай рубрыкі ў тым, што тут можна знайсці эксклюзіўную інфармацыю пра дзейнасць актывістаў руху „За свабоду" на месцах.

Што ж тычыцца ўласна руху, то большменш падрабязныя звесткі ёсць на старонцы „Рух". Там распавядаецца аб яго кампаніях, што былі праведзеныя цягам некалькіх апошніх гадоў, і маецца тэкст статута.

Ну а стаць сябрам гэтай арганізацыі, якая, дарэчы, мае афіцыйную рэгістрацыю ў беларускіх органах юстыцыі, можна запоўніўшы адпаведныя графы на старонцы „Далучыцца!".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ ы

Завоссе Міцкевіча

Вялікіх паэтаў нараджаюць не толькі маці, іх нараджае сама зямля, навакольная прырода і вышэйшая задума Творцы гэтага свету. Каб так падумаць, дастаткова пабываць у такіх мясцінах як Вязынка Янкі Купалы ці Завоссе Адама Міцкевіча. У мясціну дзяцінства знакамітага філамата, вялікага ліцьвіна, класіка польскай літаратуры давялося мне патрапіць толькі зараз, у верасні 2011 году, пераменлівым асеннім надвор'ем — дробным дожджыкам уперамешку з сонцам.

Адроджаная сядзіба ў Завоссі зараз у Баранавіцкім раёне, досыць далёка ад цэнтральных турыстычных шляхоў. Да яе вядзе дастаткова добрая асфальтоўка з амаль бязлюднымі мясцінамі навокал. Доўгі час вяліся спрэчкі, дзе ўсё ж нарадзіўся Адам Міцкевіч — яшчэ сучаснікі паэта называлі хто Наваградак, хто вёску Асавец, фігуравалі ажно некалькі Завоссяў. Урэшце з дапамогай археалагічных раскопак шуканае месца ўдалося ўстанавіць. Яно цалком супадае з апісаннямі наваколляў, якія знаходзім у баладзе „Тукай". Менавіта з Завосся закаханы Адам ляцеў на спатканні да сваёй Марылі Верашчакі ў Плужыны. У наваколлі можна заўважыць Калдычаўскае возера і абрысы колішняй Жарновай гары, якая пазней была ў значнай ступені зрэзана.

Зараз сядзіба ў Завоссі мае досыць прывабны выгляд. Шляхецкі маёнтак і экспазіцыя стваралася найперш паводле апісанняў у „Пану Тадэвушу". Першакрыніцамі сталі таксама малюнкі, пакінутыя нам Напалеонам Ордам і Эдвардам Паўловічам. Так што фальварак і нават значная частка інтэр'еру маюць праўдзівы гістарычны змест. Комплекс складаюць уласна сядзібны дом пад чаротавым дахам, побач свіронак, крыху далей абора, гумно, калодзеж-журавель, у глыбіні двара ля возера лазня. Знаўцы цвердзяць, што ў часы Міцкевіча лазні на гэтай зямлі ставілі. А вось на тэрыторыі Польшчы іх не было.

Дырэктар музея-сядзібы Анатоль Еўмянькоў рупліва дбае пра гэты куточак, разам з памочнікамі клапоціцца пра рамонт, высаджвае прыгожыя клумбы з кветкамі. Але грошай катастрафічна бракуе — каб належна зберагаць і шырыць такі ўнікальны куточак патрэбныя куды большыя сродкі. Тым больш, што пад комплекс адведзена ажно 16 гактараў зямлі, патрэбна развіваць інфраструктуру, стварыць тут гатэльчык, кавярню, зрабіць зручны маршрутны даезд (зараз рэйсавы аўтобус не даходзіць да Завосся ажно 5 кіламетраў).

Цяжка паверыць, што Міцкевіч не пісаў зусім па-беларуску. Ягоны сябар Ян Чачот пісаў, а Адам зусім не пісаў? Гэта, канешне, зусім не доказ, нават ускосны. Галоўныя доказы — беларускамоўныя рукапісы, калі яны былі, напэўна незваротна знішчаны. Пра гэта ёсць розныя гісторыі.

Неяк, яшчэ ў савецкі час, адзін з высокіх функцыянераў Гарадзеншчыны (прозвішча ў даным разе рэч неістотная), прымаючы гасцей з Польшчы, выдаў банкетны перл: „Для вас, палякаў, Міцкевіч — тое сама, што для нас беларусаў — Пушкін!". Такое вось разуменне культурнае спадчыны. Але ў савецкі час імя Міцкевіча хоць бы вярнулася пасля доўгіх гадоў забароны. Сапраўдныя ж уваходзіны Міцкевіча ў нашу культуру яшчэ не адбыліся, хоць факт таго, што сядзіба ў Завоссі ёсць філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры абнадзейвае. У Завоссе зараз прыязджаюць не толькі турысты, але і вясельныя картэжы — маладыя хочуць сфатаграфавацца ў маляўнічым куточку, дзе некалі нарадзіўся славуты паэт. „Маленства край! Ты з намі да сканання — святы, як першае каханне".

Сядзіба ў Завоссі абсаджана дрэўцамі, сланечнікамі, буяюць асеннія кветкі, а на возеры ўзлятаюць вялікія чаплі...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пётр БАЙКО

Кароткае жыццё лесніка Пятра Наско

Ляснік Пётр Наско ў 1937 годзе

Яго маладосць выпала ў незайздросны час. Мабыць, па той прычыне і жыццё гэтага праваслаўнага беларуса з Беласточчыны было не надта доўгае. Ляснік Пётр Наско пражыў усяго 28 з паловай года. Загінуў 4 кастрычніка 1944 года, падчас баёў у Італіі. Ваяваў ён у радах Войска польскага. Спачывае жа на польскім могільніку, які знаходзіцца 4 км ад Балонні.

Пётр Наско нарадзіўся 3 красавіка 1916 года, у час бежанства. Яго маці, разам з пяццю дзяцьмі, апынулася ў вёсцы Трасцяніца, што знаходзіцца недзе ў глыбіні Расіі. Бацьку, галаву сям'і, такі лёс абышоў кругам толькі таму, што яго раней прызвалі ў армію і ён ваяваў на фронце. У лістападзе 1918 года маці з дзяцьмі вярнулася з Расіі. Неўзабаве вярнуўся жывым з фронту і бацька Пятра. Атрымаў ён працу на пошце ў Крынках, тут і сталі жыць усёй сям'ёй.

Пачатковую школу прыйшлося Пятру закончыць усё ж у Белавежы. Сталася так па той прычыне, што яго бацьку перанеслі службова на працу на белавежскай пошце. Пятра зацікавіла прырода акружаючай Белавежскай пушчы, вырашыў стаць лесніком. І адпаведная школа была ж на месцы. Але каб паступіць у Дзяржаўную школу для лясніччых, трэба было найперш адбыць уступную практыку ў лясніцтве. Пётр практыкаваўся ад пачатку верасня 1932 года да канца мая 1934 года, у Надлясніцтве Белавежа. Школу для лясніччых закончыў паспяхова ў 1935 годзе. На працу накіравалі Пятра на Палессе, у Надлясніцтва Мальковічы. Працаваў ён там выконваючым абавязкі лясніччага. Незадоўга да выбуху II сусветнай вайны Пятра прызвалі ў армію. Яго часць вырушыла на фронт з Владавы.

Малады ляснік прымаў удзел у абароне Варшавы. Пасля яе капітуляцыі трапіў у канцлагер. Калі з яго вызваліўся, прыехаў у Белавежу і пачаў шукаць працу ў лясніцтве. Удалося яе атрымаць, але ненадоўга. У лютым 1940 года прыйшлося яму падзяліць долю шматлікіх тутэйшых лясных працаўнікоў і іх сем'яў. Іх усіх вывезлі ў глыб Савецкага Саюза, у Новасібірскую вобласць.

12 кастрычніка 1941 года Пётр Наско ўступіў у рады Польскага войска, яго прызначылі ў 5 батарэю 6 артылерыйскага палка. У 1942 годзе ён выехаў з войскам на Блізкі Усход.

Па Пятру асталася нямнога памятак. Родныя з Крынак у сямідзесятыя гады перадалі Белавежскаму нацыянальнаму парку м.інш. ягоны „Dziennik czynności praktykanta leśnego w Nadleśnictwie Białowieża od dnia 1.IX.1932 do 31.V.1934 roku", даваенны гадавік часопіса „Echa Leśne" (захоўваюцца яны зараз у зборах навуковай бібліятэкі), пінжак ад мундзіра лясніччага (захоўваецца ён у неэкспанаваных зборах прыродазнаўчага музея), а таксама шматлікія медалі і адзнакі (трапілі яны ў прыватную калекцыю памерлага ўжо калекцыянера Здзіслава Новака).

АДГАЛОСКА

Засцярогі да артыкула

— У мяне ёсць засцярогі да артыкула „Малітвы перад Старакорнінскай іконай Прасвятой Багародзіцы", надрукаванага ў 34 нумары „Нівы", якога аўтарам з'яўляецца Аляксей Мароз. Няпраўда, што ініцыятыва напісання спіска Старакорнінскай іконы Божай Маці выйшла ад групы прыхаджан. Маю таксама засцярогі наконт няправільнага напісання майго прозвішча ў гэтым артыкуле — „Вера Аліфярук".

Вера ОЛІФЕРУК

10 ☞працяг

Што ў Чаромсе?

ная школа" збудавалі пляцоўку гульняў пры школе ў Чаромсе за 211 560 зл. У таргах удзельнічала пяць устаноў. Перамагла фірма „Алябама" са Шчэціна.

Апрацоўваем дакументацыю на пабудову вуліц: Грунтовай, Польнай, Галэмбяй, Падлесьнай і Кароткай, як і адрэзак вуліцы Спартовай у Чаромсе за 44 587,50 зл. Выканаўца — Бюро праектаў і рэалізацыі інвестыцый „Мапі праект" у Гайнаўцы.

— У рамках нацыянальнай праграмы перабудовы лакальных дарог разбудоўваем гмінную дарогу № 109253 „б" на вуліцы Сасновай (другі тур) за 650 тыс. зл.

— У рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Інтэррэг 2007-2013 п.з. „Паправа каналізацыйнай структуры гмін Чаромха і Высокае" будзе праведзена пабудова каналізацыйнай сеткі. Кошт інвестыцыі 9 млн. зл.

У рамках праграмы вясковай прасторы пабудова каналізацыйнай злеўні Р-1 гм. Чаромха — кошт 5 мільёнаў зл. Адобрылі таргі на шматгадовы крэдыт у Банку краёвай гаспадаркі на выплату задаўжэння 1 080 тыс. зл. Апрача вышэйзгаданых інвестыцый займаліся рэалізацыяй непрадбачаных задач такіх як абмен фільтрацыйнага радовішча артэзіянскага калодзежа піццевай вады ў Кузаве — 60 тыс., рамонт аўтамабільнага табару для вывазкі нечыстотаў, рамонт вясковых святліц у Баброўцы і Апацы, жвіраванне дарог ды іншае.

Так мне тлумачылі справу гмінныя чыноўнікі. Ці гэта задаволіць мясцовую грамадскасць, пакажа час.

Адгаданка

1. бабін муж, 2. ігральны дом або рэстаран з эстрадай, 3. буйная марская млекакормячая жывёліна з доўгімі іклямі, 4. гмінны першастаяцель, 5. мастацтва хароў, аркестраў, вакалістаў, 6. узор, стандарт, 7. папулярная назва вадаёма, у які ўліваецца Волга, 8. нябыт, 9. сяброўка яблыні, слівы, вішні, 10. метка, сімвал, жэст, 11. сто еўрацэнтаў, 12. брат дачкі, 13. прылада аратага, 14. высокі чын у ваенна-марскім флоце.

			1					2	3				
	4											5	
		6			7	8					9		
	10							11		12			
13										14			

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — японскую пагаворку. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 34 нумара

Зяць, кекс, Кіш, код, Поці, Роп, рута, туман.

Рашэнне: **Кепскаму танцору і порткі шкодзяць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

26.09 — 02.10

(22.03. — 20.04.) Час гарачых рандэву. Лёс можа кінуць цябе на глыбокія воды далёка ад дому; з усім справішся. 27-30.09. будзеш думаць толькі пра... адно; пажадлівасць зацьміць табе здаровы розум! Будзь асцярожны! Адвага аплаціцца, ды не будзь лішне амбітным — можаш зваліцца з высокага каня балюча! Парабі манатоннае (бо ж мусова) і папрацуй... над самім сабою. Дысгарманічныя дні: ад 30.09. да 2.10.

(21.04. — 21.05.) Рэгулярна займайся фізічнымі практыкаваннямі. Найшчаслівейшы тыдзень з усіх знакаў. Можаш дабіцца прафесійных поспехаў калі ўсё будзеш рабіць лёгка, хутка і з „іскаркай". У каханні навучышся прабачаць і адкрыеш спосаб прыцягнуць да сябе ўвагу.

(22.05. — 22.06.) Пільнуй свой язык. Будуць табою цікавіцца маладзейшыя асобы. Будзь больш актыўны, займіся спортам, ды толькі табе прыемным. Да нічога сябе не прымушай. 26-30.09. хтосьці можа цябе несправядліва ацаніць, і хоць бы ты ставаў на галаве, не ўдасца гэтай думкі змяніць.

(23.06. — 23.07.) З прыемнасцю будзеш прабываць дома, зробіш яго яшчэ больш утульным. Кароткае, ды вельмі мілае падарожжа. Маеш цяпер „добрападвешаны" язык, ніхто цябе не перагаворыць! Нават калі ашчаднасці ў цябе невялікія, можаш выдаць больш і не пераймацца заўтрашнім днём. Можаш пачаць сямейны бізнес. Не будзеш праводзіць вечароў у самоце.

(24.07. — 23.08.) Да 28.09. не ўсе цябе палюбяць, не насі нос высока. 26-30.09. захавай спакой, не правакуй лёсу і пазбягай небяспечных сітуацый. Не ўпірайся без толку на сваім. Памятай, што жыццё ў пары гэта не рынг, а тваё не заўсёды мусіць быць зверху. Выгады ў фінансавым плане, ды прыбыткі хутчэй з неафіцыйнай крыніцы. Ды раскідаючыся гэтымі грашыма, страціш іх хутка.

(24.08. — 23.09.) Паўкрыж 25-30.09. паўплывае на цябе вельмі адмоўна, усе твае высілкі могуць пайсці ўпустую. 26-29.09. не бярыся за важныя рашэнні, бо сітуацыя, у якой ты ўпэўнены, неспадзявана можа змяніцца. Хоць багатае кампанейскае жыццё, наўкола цябе будуць мілыя, сімпатычныя, бескарыслівыя людзі. Высвятліш старыя непаразуменні са Скарпіёнам. Дысгарманічны дзень 1.10.

(24.09. — 23.10.) 27-30.09. прадбачваюцца праблемы ў пачуццях. Партнёр не дасца да нічога пераканацца. Маладзік Месяца 27.09. — час балансу (выйдзе на тое, што ты на плюсе, таксама фінансавым). Будзь акуратны са здароўем, ды на таблеткі яшчэ рана — у цябе папросту стома.

(24.10. — 22.11.) Час дзеяння пачнецца ў кастрычніку, пакуль збірай сілы і плануй. 26-30.09. зоркі абнажаць тваю слабасць; не паказвай, што можаш больш чым у рэальнасці. Будзь асцярожны ў асабістых справах і каханні. Патрэбны табе цяпер талент сапраўднага лагістыка, „дырэктара базы"; прыйдзецца адкрыць стары нататнік і пашукаць старых сувязей. Канцэнтруйся і адэкватна рэагуй. Пачнеш працаваць на далёкую будучыню.

(23.11. — 22.12.) Адзінокі Стралец хутчэй хай паставіць на сяброўства, не на каханне. Калі чагосьці не ведаеш, лепш маўчы (няма чаго саромецца, не кожны з'яўляецца спецыялістам ва ўсім!). Часцей будзеш адчуваць гармонію чым дыскамфорт. Можа паявіцца новы сябра (хутчэй раней ужо вядомы, з якім наблізішся з-за інтарэсаў). Будзеш аўтарытэтам.

(23.12. — 20.01.) 27-30.09. — бяспека і матэрыяльны камфорт. Развяжаш здаўна турбуючую цябе праблему. Пасля звязваючага табе рукі жніўня, верасень дасць „аддушыну", ды надалей будзеш змагацца з „дэманамі" (аж да 22.12.!, але канчаткова пераможаш). Дысгарманічныя дні: 29, 30.09, 1 і 2.10.

(21.01. — 19.02.) Да 29.09. не плануй падарожжа. З 20 мая аж да 9.10. ты ў „астралагічным водпуску", таму ўсё складана, часам шыварат-навыварат. Пацярпі яшчэ, павесялееш, з прыемнасцю будзеш хадзіць на працу ці ў школу! Сядзь на лягчэйшую дыету. І цікуе за табою каханне!

(20.02. — 21.03.) Час разабрацца ў пачуццях, выбраць шлях. Парабі парадкі, можаш стаць „залатой рыбкай". І чакае цябе сапраўднае каханне, або ўпэўнішся ў пачуццях, якія аслаблі ад падзей двухмесячнай даўнасці. Вельмі добры дзень — 1.10.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Меў быць Парыж (2)

У канцы XVIII стагоддзя наступае парафіяльная ракіроўка між Сухаволяй і Хадароўкай, цэнтр парафіі пераносіцца з апошняй у Сухаволю. Сталася гэта, як здаецца, даволі нечакана, бо яшчэ ў 1784 годзе хадароўскі пробашч Ян Данішэўскі так апісваў Сухаволю: „Suchowola, wieś klucza dubasiewskiego na północ od kościoła [у Хадароўцы — А.В.] pół mili odległa, gdzie jest szkoła żydowska i niemało żydów różnych mieszkających, miasteczkiem część jedną tej Sucheywoli nazywają." Але вось цікава, чаму так сталася, з якой прычыны адбылася названая мною ракіроўка; аўтары гістарычных звестак пра Сухаволю неяк абыходзяць гэтае пытанне. Бо справа здаецца быць даволі цікавай з неафіцыйнага пункту гледжання.

У 1698 годзе кароль Аўгуст II дае прывілею наступнага зместу: „Oznaymuiemy tym listem przywileiem naszym wszem wobec i każdemu, komu o tem wiedzieć należy. Jż stosuiąc się do wniesioney próźby przez panów rad naszych, przy boku naszym rezyduiących (...) wszystkich niewiernych żydów Suchey Woli w kluczu Chodorowskim, leśnictwie Nowodworskim oekonomii naszey, w powiecie Grodzieńskim będących, abyśmy onym wolne mieszkanie w pomienionym miejscu Suchey Woli y zbieraniu się, tudzież należyte, z nadaniem onym wolności, według przywileiów in personas żydów całego xięstwa Litewskiego, od naiaśnieyszych antecessorów naszych nadanych y od nas approbowanych, budowanie pozwolili. My król, łaskawie skłoniwszy się do pomienioney prozby (...) aby tym bardziey popularyzowało te mieysce, rzeczonym żydom wszystkim Suchowolskim w przerzeczonym teraz mieszkaiącym i tym, którzy się będą do tego mieysca garnąć, wolne mieszkanie i zbieranie się daiąc, im wolność praw onych swobod domki y szkołę, na którym mieyscu sobie upodobaią, erigować, czemu ekonom tameczny lub administrator przeczyć nie ma, lecz owszem dopomagać, mieysce wydzielić powinien tymże żydom; wszelkich handlów używać różnemi towary, kramy swoie, kramki otworzyste buduiąc, handlować, trunki różne w domach i kramkach szynkować, laźnie, iatki mieć, towary mieyskie większe, dróższe y podleysze chowaiąc, przedawać, funtem ważyć, łokciem mierzyć y wszelkich sposobów do przystoynego pożywienia wynaydować, grunta skupować, rzemieślnikom (...) rzemiosła robić, mieysca na mogiłki te, na którym zwykli się chować, to iest borek za młynem circumcirca, bez żadnego podatku płacenia, ciała umarłych tak w święta, iako y w powszednie dni przy wszelkim bezpieczeństwie na kopiskach chować pozwalamy. Mocą którego przywileiu naszego pomienione żydzi tego wszystkiego wolni y mocni będą, nie pełniąc żadney pensyi do dworu naszego tamecznego od domków wkoło szkoły tylko będących, mogiłek, łaźni i bożnic bez żadney ni od kogo przeszkody (...) używać y wszelkich pożytków wynaydować. (...) Do czego ręką naszą podpisawszy się pieczęć przycisnąć rozkazaliśmy. Dan w Grodnie, dnia dwudziestego ósmego miesiąca Decembra, roku tysiąc sześćset dziewięćdziesiąt ósmego, panowania naszego wtórego roku." З абедзвюх прыведзеных цытат можна дадумоўвацца, што мясцовае насельніцтва, а дакладней кажучы — касцельныя і адміністрацыйныя ўлады — неахвотна ставіліся да яўрэйскіх новапасяленцаў мабыць не дазваляючы ім сяліцца ў парафіяльнай Хадароўцы. Магчыма таксама, што вызначанае каралём месца было ім больш выгаднае, бо тудою пралягала найзручнейшая дарога з Гонязі ў Гародню, а на рацэ Бобры ў Двуглах працаваў порт, пра які Ян Данішэўскі так згадваў: Rzeka Bobra portowa do Gdańska, jeden ma przystępny grondzik w Litwie, parafii chodorowskiej, Dwugły nazwany, gdzie statki ładują i szpichrze stoją JKMci portowe ekonomiczne. Так вось кароль вызначыў ім месца далей ад парафіяльнага цэнтра, на паўночным канцы тагачаснай вёскі Сухаволя, якая ў той час супадала з цяперашняй вуліцай Беластоцкай, што адыходзіць ад гарадскога рынку ў паўднёвым напрамку; на поўнач ад рынку, у межах усё ж цяперашняй Сухаволі былі яшчэ тады вёскі Асіннік і Альшанка. Значыць жыды атрымалі месца для пасялення акурат на месцы цяперашняга сухавольскага рынку і мясцовым уладам кароль забараніў супраціўляцца гэтаму працэсу.

Кароль такім чынам дазволіў яўрэям весці ў Сухаволі гандлёва-вытворчую дзейнасць і ім пасля гэтага трэба было прыцягнуць кліентаў у свае крамы і майстэрні. Дзеля гэтага яны і сталі хадайнічаць за прыцягненне туды мясцовага насельніцтва, не грэбуючы і выкарыстаннем для гэтай мэты яго рэлігійнасці. І не толькі прызначылі для пабудовы сухавольскага касцёла свае гранты, бо, здаецца, пахадайнічалі яшчэ шырэй...

На правабярэжжы Бобры, насупраць Сухаволі і Двуглаў, у цяперашняй Штабінскай гміне, знаходзіцца вёска Яміны. Афіцыйны сайт Элцкай дыяцэзіі так цяпер піша пра яе: „W 1755 roku Teodora Sapieha ufondowała na piaszczystej górce w Jaminach drewniany kościół, ale nie uposażyła parafii w ziemię. Uczynił to w 1793 roku król Stanisław August, jednocześnie nakazując budowę nowego kościoła, w miejsce poprzedniego, który spłonął w 1789 roku. Wniesiono jednak tylko prowizoryczną kaplicę, a w 1845 roku przewieziono do Jamin drewniany kościół z Augustowa, który do dzisiaj jest kościołem parafialnym." Але пра той жа касцёл Аляксандр Палуянскі так пісаў у 1859 годзе: „...przypadkowo w r. 1789 zgorzał, zastąpiony został kaplicą z drzewa sosnowego kosztem parafjan zbudowaną. Lecz budowa tej świątyni nie odpowiadała swemu celowi, bo miała kształt szopy słomą krytej, bez wieży, a długość jej wynosiła tylko łokci 30, szerokość zaś łokci 12; dlatego też w roku 1793 przysposobiono kóp ośm klocków drzewa na budowę obszerniejszego kościoła i król Stanisław August przeznaczył proboszczowi kompetencji rocznej złp. 700, tudzież ogrodu półtora morga i łąki 4 morgi. Nim jednak do dzieła zamierzonego przystąpiono, drzewo zabrane zostało na budowę kościoła w Suchowoli (...) dokąd też 4 morgi łąki proboszczowi parafji Jaminy przeznaczonej odpadły."

Усё адбылося адносна хутка, бо ж яшчэ ў 1784 годзе пра нейкае касцельнае збудаванне ў Сухаволі не было і згадкі, а неўзабаве сталася так, як піша зараз афіцыйны сайт Беластоцкай архідыяцэзіі: „Pierwszy kościół w Suchowoli wybudowano z drewna w 1791 r. W 1798 r. z nakazu władz pruskich nabożeństwa parafialne przeniesiono z kościoła w Chodorówce, który był w bardzo złym stanie, do Suchowoli. Tu kościół jeszcze nie był wykończony. Z Chodorówki przewieziono do kościoła suchowolskiego „wszystko, co było niezbędne do sprawowania Mszy św. i nabożeństw", w tym cztery ołtarze. Odtąd parafia nosiła nazwę „chodorowsko-suchowolskiej", a później już tylko suchowolskiej. W 1876 r. wierni podjęli starania o wybudowanie nowej świątyni. Zamówiono projekt u grodzieńskiego architekta Jakuba Fordona i po otrzymaniu pozwolenia od grodzieńskiego gubernatora rozpoczęto w 1879 r. budowę świątyni. (...) Dnia 7 X 1885 r. kościół został poświęcony i rozpoczęto odprawiać w nim nabożeństwa. Konsekracja świątyni miała miejsce 10 IX 1905 r. Dokonał tego biskup wileński Edward Ropp. Podczas II wojny światowej cofający się Niemcy, podminowali i 28 VII 1944 r. wyburzyli front kościoła wraz z dwiema wieżami."

Пасярэдзіне колішняй вёскі Сухаволі, значыць пасярэдзіне цяперашняй Беластоцкай вуліцы, зараз красуецца мадэрны будынак новай гасцініцы. Побач яго табліца з інфармацыяй, што быў ён пабудаваны з прыцягненнем еўрасаюзных фондаў, гэтак як шматлікія дарогі ў наваколлі Сухаволі, як раскошны фантан у „цэнтры Еўропы". Азіраючыся на гісторыю пабудовы сухавольскага касцёла рызыкну сцверджанне, што Сухаволя на працягу цэлай сваёй гісторыі карысталася прыцягненнем вонкавых фондаў, дзякуючы свайму месцу на расхадных дарогах у цэнтры Еўропы. Але, як з народнай дэманалогіі вядома, на расхадных дарогах цікаюць нечаканасці...

Наведаў я Сухаволю ў разгар забастоўкі ў беластоцкім пэкаэсе, таму аўтобусы ў Беласток адпраўляліся адтуль даволі рэдка. Калі я прыйшоў на тамашні аўтобусны прыпынак, пабачыў, што аўтобус „Ваяжора" адправіцца за амаль дзве гадзіны, а аўтобус сувальскага пэкаэсу яшчэ пазней. Некалькі тыдняў раней прыснілася мне была вандроўка па заходне-паўночных акраінах Сухаволі, той сон расплыўся і цяпер у мяне з'явілася нагода пабачыць тыя акраіны ў рэальнасці. Падаўся я асфальтоўкай у бок Карповіч, у бок закрытага акурат моста на Бярозаўцы. Побач гэтай дарогі цячэ буйны раўчак, які астаўся на месцы буйнейшай калісь рэчкі Альшанкі. Ян Гузоўскі пісаў пра яе так: „Na obecne zmiany biegu rzeki Olszanki przyczyniło się sypanie grobli łączącej wieś Karpowicze z Suchowolą. Na całej długości tej grobli powstał rów, w którym swe wejście znalazła woda. (...) Dawne koryto rzeki zabliźniło się, chociaż w niektórych miejscach do dziś pozostały jego ślady."

У адным месцы над гэтай рачулкай звочыў я кладачку побач броду і тою кладачкай выйшаў на пралягаючыя па пашы трактарныя каляіны і гэтай „дарогай" выйшаў на неадлеглую шашу з Гонязя ў напрамку Гародні, з якой павярнуў на пясчаную дарогу непасрэдна ў напрамку цэнтра Сухаволі. Гэтая дарога абсаджаная вербамі, дрэвамі, якія, мабыць, давалі натхненне Шапэну. Не дзіва, вербы менавіта з'яўляюцца выдатным матэрыялам для прыроднай разьбы, ад якой выліваецца непаўторная эстэтычная насалода. Фігуры старых вербаў прадстаўляюць нейкі diabolical dance, што здаецца быць крыху тлумачыць той генез горада Сухаволі акурат на важных расхадных дарогах.

ISSN 0546-1960